ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

# ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

ОРГАН САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ І КАМІТЭТА ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВА ПРЫ СОВЕЦЕ МІНІСТРАЎ БССР

№ 32 (891) | Субота, 9 жніўня 1952 года | Цана 50 кап.

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

**Першая старонка.**

**Перадавы.** — Абласны Дом народнай творчасці.
**У. Краўчанка.** — За рулём камбайна — Апанас Бачкоў.

**А. Рыбак.** — На радзіме Якуба Коласа.
**В. Сямёнаў.** — Стваральнікі машын.

**Другая старонка.**

**К. Корсакас.** — Шматвяковая дружба.
**І. Шымкус.** — Перад вялікім экзаменам.
**В. Мікалайціс-Пуцінас.** — Незакранутыя тэмы.
**А. Венцлова.** — Партыя (верш).
**В. Рэймерыс.** — Вясна на плошчы Чарняхоўскага (верш).
**А. Жукаўскас.** — Кнігі да дэкады.

**Трэцяя старонка.**

**А. Зархі.** — Фільм-спектакль «Паўлінка».
**П. Рунец.** — Залатыя рукі.

**Чацвертая старонка.**

**П. Сушко.** — У цёмным царстве купецкай Расіі.
**П. Падгорны.** — Партыйныя арганізацыі і сельскія бібліятэкі.
**М. Модэль.** — Сатыра на падпальшчыкаў вайны.
**І. Науменка, В. Плешавеня.** — Рэчыцкі «летапісец» (фельетон).

## Абласны Дом народнай творчасці

У палажэнні аб Доме народнай творчасці сказана: «Дом народнай творчасці... аказвае рэпертуарную і кансультацыйную дапамогу самадзейным калектывам і прадстаўнікам народнай творчасці... садзейнічае развіццю ўсіх відаў і жанраў мастацкай творчасці народа»...

Наколькі-ж паспяхова вырашаюцца гэтыя задачы?

На гэтае пытанне адказваюць у першую чаргу тыя дасягненні самадзейнага мастацтва рэспублікі, якія неаднаразова былі прадэманстраваны на аглядах і выстаўках народнай творчасці ў раённых, абласных цэнтрах і ў сталіцы Беларусі.

Гэтыя агляды праходзілі, як святочныя алімпіяды народных талентаў — яркіх, самабытных, незабыўных.

Хто не памятае цудоўныя харавыя, танцавальныя калектывы Пінщчыны, Бабруйшчыны, Палесся і другіх абласцей рэспублікі — калектывы, арганізаваныя ў свой час не без дапамогі абласных Дамоў народнай творчасці.

У гэтым годзе пачалі дзейнічаць тэатры народнай творчасці ў Магілёве, Гродна, Мазыры, Бабруйску і Баранавічах.

Вельмі карысная ініцыятыва! І развілі яе іменна Дамы народнай творчасці гэтых абласцей.

Нядаўна ў многіх раённых і абласных цэнтрах рэспублікі з поспехам прайшло свята песні, у якім прынялі ўдзел дзесяткі тысяч калгаснікаў, рабочых, служачых і школьнікаў Беларусі.

Многа творчай ініцыятывы і арганізацыйнага таленту ўклалі ў гэтую справу работнікі абласных Дамоў народнай творчасці. На дапамогу ім прышла велізарная армія энтузіястаў мастацкай самадзейнасці, сельскай і гарадской інтэлігенцыі. Гэта тая сіла, на якую абапіраецца і павінен абапірацца кожны абласны Дом народнай творчасці. І там, дзе яна ўмела арганізавана і скарыстана, — вынікі гаворыць самі за сябе. Так Гродзенскі Дом народнай творчасці здолеў арганізаваць студыю мастацкай вышыўкі, якую ўзначалілі людзі, што любяць і разумеюць гэтае мастацтва. Студыйцы вышылі цудоўныя габелены, пано, партрэты і цэлыя кампазіцыі, высока ацэненыя на рэспубліканскіх і Усесаюзных выстаўках самадзейнага мастацтва. Віцебскі Дом народнай творчасці ўмела скарыстаў частыя выезды тэатра імя Я. Коласа ў раённыя цэнтры вобласці для арганізацыі там драматычных самадзейных калектываў.

Там-жа, дзе людзі працуюць без творчай ініцыятывы, самадзейнасць развіваецца стыхійна, ад выпадку да выпадку. Доўгі час у такім становішчы былі Гомельскі, Полацкі і Мінскі абласныя Дамы народнай творчасці. Мінскі Дом народнай творчасці і да гэтага часу ніяк не можа выбіцца з разраду «сярэдніх», хоць па свайму значэнню ён павінен быць самым перадавым. На мінулых аглядах мастацкай самадзейнасці Мінская вобласць займала адно з апошніх месц. Яно і не дзіва. Самадзейнасць Мінска, напрыклад, і да гэтага часу не мае, па сутнасці, ніякага кіраўніцтва, бо Мінскі абласны Дом народнай творчасці не займаецца самадзейнасцю горада.

Наспела пытанне арганізацыі Мінскага гарадскога Дома народнай творчасці па прыкладу многіх сталічных гарадоў Саюза.

Самай вялікай апорнай сілай у развіцці мастацкай самадзейнасці кожнай вобласці з'яўляюцца работнікі культурна-асветных устаноў. Раённыя Дамы культуры, хаты-чытальні, сельскія клубы — вось цэнтры, вакол якіх вырастае самая масавая народная самадзейнасць.

Але гэтыя самыя масавыя цэнтры менш за ўсё адчуваюць дапамогу абласных Дамоў народнай творчасці. Два-тры метадысты абласнога Дома не ў сілах, безумоўна, ахапіць сотні творчых калектываў. Тут трэба скарыстаць клубны актыў, актыў раённых Дамоў культуры, хат-чытальняў. Іменна гэтыя людзі рашаюць поспех масавага ўздыму народнай творчасці.

Між тым, падрыхтоўка гэтых кадраў далёка не адпавядае задачам развіцця масавага самадзейнага мастацтва.

Два культасветвучылішчы ў Магілёве і Гродна, якія рыхтуюць загадчыкаў хатчытальняў і клубных работнікаў, вельмі мала навучаюць студэнтаў асновам мастацкага чытання і нотнай граматы. Рэдка хто з выпускнікоў гэтых вучылішчаў можа кіраваць самадзейнасцю, а трэба, каб кожны загадчык хаты-чытальні ці сельскага клуба кіраваў адным якімнебудзь самадзейным гуртком. А мастацкія кіраўнікі раённых Дамоў культуры, ад якіх у вялікай ступені залежыць поспех развіцця народнай самадзейнасці ў вобласці, зусім не рыхтуюцца. Таму не дзіва, што з 175 мастацкіх кіраўнікоў раённых Дамоў культуры большасць не мае спецыяльнай падрыхтоўкі. Курсы і нарады мастацкіх кіраўнікоў, загадчыкаў хат-чытальняў, якія час-ад-часу праводзяцца, па сутнасці не могуць вырашыць справы падрыхтоўкі кадраў. Само жыццё настойліва патрабуе арганізаваць пры вучылішчах аддзяленні мастацкіх кіраўнікоў самадзейнасці.

Народная творчасць дасягнула сёння такога ўзроўню, што яна патрабуе высокакваліфікаванай дапамогі. У раённым Доме культуры патрэбна мець ужо спецыялістаў харавога спявання, інструменталістаў, метадыстаў па жывапісу, скульптуры, танцах, рэжысёрскай і акторскай творчасці.

У падрыхтоўцы гэтых спецыялістаў павінны дапамагчы навучальныя мастацкія ўстановы рэспублікі, якія пакуль што не займаюцца гэтай вялікай і пачэснай справай.

Камітэт па справах мастацтва пры Савеце Міністраў БССР павінен штогод вызначаць поўную колькасць выпускнікоў музычных школ, мастацкага вучылішча, тэатральнага інстытута для работы ў мастацкай самадзейнасці.

У справе метадычнай дапамогі абласныя дамы робяць не ўсё, што трэба. У большасці выпадкаў яны пакідаюць за сабой толькі функцыі перадатчыкаў тых матэрыялаў, якія атрымліваюць з Рэспубліканскага Дома народнай творчасці або з Масквы. Рэспубліканскі Дом народнай творчасці не заўсёды дае для абласных Дамоў прыклады добрай творчай ініцыятывы. Нядаўна ён выпусціў рэкамендацыйны спіс рэпертуарных матэрыялаў для гурткоў мастацкай самадзейнасці да ўборачнай кампаніі. У гэтым спісу ёсць усе п'есы на калгасную тэму, пералічаны многія вершы, песні і ўрыўкі з паэм і празаічных твораў. Але была-б большая карысць, калі-б з гэтых матэрыялаў былі зроблены ўзорныя тэматычныя канцэрты. Гэта быў-бы прыклад абласным дамам і мастацкім калектывам, як можна і трэба арганізаваць у калгасным клубе цікавы вечар-канцэрт.

Надзвычай прымітыўна пастаўлена справа масавага размнажэння рэпертуарных матэрыялаў. Рэпертуар размнажаецца ў вельмі абмежаванай колькасці экземпляраў. Гэта значыць, што пераважная большасць мастацкіх калектываў і ў вочы не бачыць рэпертуарных матэрыялаў.

Не лепш і з песенным рэпертуарам. Калі аднаактоўкі ці вершы рассылаюцца надрукаванымі на машынцы ці на ратапрынты, дык ноты ніяк не рассылаюцца. Таму самадзейныя калектывы вымушаны развучваць песні толькі па радыё, на слых.

Ясна, што паколькі Дзяржаўнае выдавецтва БССР не спраўляецца з выпускам рэпертуарных матэрыялаў для мастацкай самадзейнасці, Камітэту па справах мастацтва пры Савеце Міністраў БССР трэба было-б сур'ёзна паклапаціцца аб стварэнні трывалых баз для масавага надрукавання рэпертуарных матэрыялаў.

Кіраўнікі і работнікі абласных Дамоў народнай творчасці павінны праяўляць больш ініцыятывы, каб выкарыстаць усе магчымыя сродкі і формы работы для далейшага развіцця масавай народнай самадзейнасці, каб яшчэ лепш дапамагаць большэвіцкай партыі ў комуністычным выхаванні працоўных.

## За рулём камбайна — Апанас Бачкоў

★

Усевалад КРАЎЧАНКА

★

Зараз на Палессі стаіць гарачая пара— у самым разгары жніво, уборка і абмалот ураджаю. З першымі промнямі сонца, ледзь толькі знікае начная раса, прасторы калгасных палёў абуджае роўны шум камбайнаў, стракатанне жняярак, галасы жней. Там, дзе раніцой перад табой калыхалася бяскрайняе жоўтае мора жыта, увечары ўжо бачыш зжатае поле, на якім сям-там стаяць толькі спрасаваныя камбайнавым капніцелем кучкі саломы, або роўнымі радамі выстраіліся бабкі.

Выдатны ўраджай выдаўся сёлета на Палессі! Жыта стаіць, як сцяна, высокае, вышэй чалавечага росту, густое, сцяблы згінаюцца пад цяжарам буйных налітых каласоў. Росту хлябоў паспрыяў добры ўраджайны год. Але рашаючую ролю ў атрыманні высокага ўраджаю мела, вядома, не надвор'е. Рашаючую ролю мела тое, што калгаснікі сёлета шчыра, не шкадуючы сіл, папрацавалі на палях, вывезлі намнога больш, чым у мінулыя гады натуральных і мінеральных угнаенняў, добра даглядалі пасевы. Рашаючую ролю мела тое, што МТС вобласці, узбагачаныя вялікай колькасцю першакласнай сельскагаспадарчай тэхнікі, здолелі сёлета ў значна большым аб'ёме механізаваць усе сельскагаспадарчыя работы на палях, апрацаваць калгасныя палеткі так, як гэтага патрабуе перадавая агратэхніка.

На ўборцы ўраджаю сёлета першае слова такеама належыць механізатарам. Ды яно інакш і быць не можа. Сваімі сіламі — уручную і прасцейшымі ўборачнымі машынамі — калгасы не здолелі-б управіцца без страт і ў кароткі час з багатым ураджаем. А камбайнавы парк машынна-трактарных станцый вобласці значна вырас, нават у параўнанні з мінулым годам. Бадай што няма на Палессі МТС, якая не мела-б дзевяць — дзесяць, а то і больш камбайнаў.

Акрамя таго, на дапамогу беларускім хлебаробам ідуць механізатары поўдня нашай краіны, дзе ўборка хлябоў ужо закончылася. На Палессі з дня на дзень чакаюць прыбыцця 60 камбайнаў з МТС Грозненскай вобласці і Краснадарскага краю. Такая таварыская выручка, манеўраванне дзяржаўнай тэхнікі — новая цікавая рыса ў практыцы работы нашых МТС.

У мінулым годзе многія камбайнеры Палесся паказалі ўзоры высокай прадукцыйнасці працы, у два-тры разы перавыканалі дзяржаўны план уборкі. Усёй рэспубліцы вядома імя камбайнера Слабадской МТС т. Місевіча, які ўбраў на камбайне С-4 530 гектараў зернавых, камбайнера Ельскай МТС — комуніста тав. Бачкова, які ўбраў 529 гектараў, і інш. Сёлета лепшыя камбайнеры Палесся ўзялі на сябе яшчэ больш высокія абавязацельствы. Так, напрыклад, т. Місевіч даў слова на ўдасканаленым камбайне С-4 убраць 700 гектараў, Апанас Бачкоў на камбайне старой канструкцыі — 600 гектараў. Ва ўмовах Палесся, дзе пераважаюць невялікія хлебныя масівы, гэта вельмі высокія абавязацельствы і, каб споўніць іх, патрэбна выдатная тэхнічная падрыхтаванасць камбайнера, майстэрства, зладжанасць экіпажа, наватарскі подзвіг.

Як і ў мінулым годзе, Апанас Бачкоў працуе ў калгасе імя Жданава Ельскага раёна. Памочнікам яго прызначаны студэнт пятага курса Інстытута механізацыі Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі Валянцін Рашал, між іншым, мясцовы хлапец, сын старшыні калгаса. Гэта яго апошняя практыка перад дыпломнай работай, да якой ён неўзабаве павінен прыступіць, каб атрымаць званне інжынера.

Тое, што расказвалі пра мінулагоднюю работу Апанаса Антонавіча Бачкова і пра яго сёлетняе высокае абавязацельства, не магло не выклікаць цікавасці да яго, жадання пазнаёміцца з ім, даведацца, у чым-жа сакрэт яго выдатнага вытворчага поспеху, яго майстэрства.

«Творчы сакрэт» Апанаса Бачкова, калі яго сфармуляваць каротка, на нашу думку, заключаецца ў яго выключна свядомых адносінах да сваёй работы, у яго пастаянных наватарскіх пошуках, у яго неспакойным, імклівым характары. Наша першае знаёмства з Бачковым адбылося не ў полі, а ў майстэрні МТС. Толькі што прайшла навальніца, і касіць жыта камбайнам было нельга. У полі, у час чарговай запраўкі камбайна бензінам, у Бачкова ўзнікла новая думка і, выкарыстаўшы вымушаны прастой, ён адразу-ж прыйшоў у МТС. Гэта сярэдняга росту, з хударлявым загарэлым тварам мужчына, у брызентавай куртцы і такіх-жа штанах. Энергічны ў рухах, са светлымі пранікліваымі вачыма, Апанас Бачкоў ствараў ураджанне ўдумлівага, настойлівага чалавека, які добра ведае сваю справу і таму ўпэўнены ў сваіх сілах.

— Бачыце, — даўшы ўказанне абточваць нейкі круглы кавалак жалеза свайму памочніку Валянціну Рашалу, растлумачыў Апанас Антонавіч, — на нарадзе камбайнераў нашай МТС я паабяцаў сэканоміць за сезон 400 кілаграмаў гаручага. Паабяцаў — а цяпер трэба-ж выконваць слова... І вось сёння я знайшоў адну з крыніц, дзе я «злаўлю» гэтыя 400 кілаграмаў.

Мы вышлі з майстэрні МТС і селі на траве, у цяньку пад дрэвам. Бачкоў узяў у рукі лісток паперы і аловак.

— Як у нас звычайна праводзіцца запраўка камбайна ў полі? З бочкі мы наліваем бензін у вядро, а затым нясем вядро да камбайна і пераліваем бензін у бак. Запраўка—14 вёдраў. Гэта значыць, што на працягу адной запраўкі мы 28 разоў пераліваем бензін у вядро і з вядра. За дзень мы запраўляем камбайн два разы, а за ўвесь сезон — разоў 80. Я заўважыў, што як-бы акуратна запраўшчыкі ні нахілялі бочкі, як-бы акуратна ні стараліся наліваць, усёроўна бензін крыху праліваецца на зямлю. Няхай гэта будзе зусім нязначная колькасць бензіну, скажам 50 — 70 грамаў на вядро, але перамножце гэтыя 50 — 70 грамаў на 28, ды затым яшчэ на 80, па колькасці заправак за сезон. Колькі гэта атрымаецца дарэмных страт?.. Ну, я і падумаў, што можна-ж усё зрабіць інакш, можна не пераліваць бензін у вядро і з вядра, а шлангам перакачваць проста з бочкі ў бак. Для гэтага трэба зрабіць толькі спецыяльную заправачную пробку з двума адтулінамі і насосам гнаць бензін па такому-ж прынцыпу, як піва з бочкі качаюць — вось, глядзіце...

І Бачкоў накідаў на паперы чарцёж пробкі і ўсё нескладанае прыстасаванне да свайго бензанасоса.

Такая ўдумлівасць, вынаходлівасць, творчая здагадка характэрна для ўсёй работы Бачкова. Абавязаўшыся ўбраць за сезон 600 гектараў, ён прадумаў і прадугледзеў усё, што можа даць яму хоць адну сэканомленую хвіліну, і ўсё гэта ўзяў сабе на ўлік. З хвілін, як вядома, складаюцца гадзіны, а з гадзін — дні, залатыя дні ўборкі, якая, па трапнаму вызначэнню таварыша Сталіна, з'яўляецца справай сезоннай і не любіць чакаць: убраў своечасова — выйграў, спазніўся ва ўборцы — прайграў...

Незадоўга да пачатку касавіцы, Апанас Антонавіч абышоў з брыгадзірам калгаса ўсе палеткі, прызначаныя пад камбайнавую ўборку, устанавіў чарговасць уборкі і склаў строгі графік пераезду агрэгата з поля на поле. Затым склаў пагадзінны графік уборкі палёў, зыходзячы з вытворчай магутнасці камбайна. Ён ведаў, якога чысла і ў які дакладна час ён павінен будзе закончыць уборку кожнага поля. Загадзя паклапаціўся Бачкоў і аб замацаванні за камбайнам фурманаў з бястаркамі для адвозкі намалочанага збожжа.



— Я вам так скажу, — расказвае Апанас Антонавіч, — поспех камбайнера — у яго выдатным веданні справы, у яго пастаяннай барацьбе за эканомію часу. Возьмем да прыкладу такую справу, як манеўраванне хуткасцямі. Для ўмелага камбайнера гэта невычэрпная крыніца дадатковага часу. Ёсць такія сярод нас, што як паставяць камбайн на другую хуткасць, то і гоняць, пакуль гаручае не скончыцца. А ў С-4, не забудзьце, шэсць рабочых і дзве транспартныя хуткасці наперад, ды дзве назад. Густое, рослае жыта — дык павольней рухайся, каб хлебная маса не забівала транспартнага палатна і шнэкаў, больш рэдкае — стаў на большую хуткасць, а на розных там перагонках і заваротах — пераключайся на транспартную... Або, скажам, сустракаецца такая бяда — жыта высокае, але палеглае, калі касіць яго звычайна, то страты будуць такія, што хоць спыняй работу. Я касавіцу такога жыта вяду з боку палегласці чаўночным метадам з такім разлікам, каб скошаны хлеб увесь час клаўся на цэнтральны транспарцёр. Страты пры такім жніве збожжа зводзяцца да нуля.

Праз колькі дзён мы зноў наведалі калгас імя Жданава, і на гэты раз засталі знатнага камбайнера ў полі. У напружанні прыўстаўшы з крэсла, Апанас Бачкоў вёў камбайн, засяроджана сочачы за шнэкамі і адначасова паглядаючы на поле. Камбайн увесь дрыжэў і калыхаўся, падлога пад нагамі хадзіла, нібы жывая. З рукава ў бункер роўным густым ручаём лілося зерне. Бачкоў вёў камбайн з такім разлікам, каб ён працаваў на поўны захват хедэра — усё адно да аднаго, усё да таго, каб як мага паўней выкарыстаць магчымасці і магутнасць цудоўнай машыны.

Наперадзе сярод жоўтага мора хлябоў тырчэла невысокая бярозавая вешка. Набліжаючыся да яе, Бачкоў паменшыў хуткасць. Гэта была адзначана няроўнасць поля — прадбачлівы камбайнер загадзя абышоў поле, праверыў яго, каб не трапіць у яму, пазбегнуць нечаканай аварыі.

Пад'язджаючы да канца загонкі, Бачкоў падаў рукою знак возчыкам. Пакуль з бункера выгружалі зерне, Апанас Антонавіч з памочнікам выкарысталі час і змазалі ў некалькіх месцах агрэгат. Усяго на камбайне 156 пунктаў змазкі, але розныя з іх патрабуюць змазкі ў розны час. Бачкоў старанна сочыць за змазкай агрэгата — хочаш, каб машына спраўна служыла, дагледзь яе, паклапаціся аб ёй...

Праз некалькі хвілін над полем зноў пачуўся роўны магутны грукат, і камбайн імкліва паплыў у жоўтую далячынь, пакідаючы за сабою роўна падстрыжаную пожню.

Ельская МТС,
Палеская вобласць.

*НАШЫ БУДНІ*

## На радзіме Якуба Коласа

Аб тым, якой была яго родная вёска ў дакастрычніцкі час, Якуб Колас пісаў:

Між узгоркаў над ракою
Выглядае сіратою
Наша беднае сяло.
Убраў стрэхі мох калматы,
Набок скрыўленыя хаты,
Як-бы ў дол яно ўвайшло.

Зусім змяніла сваё аблічча вёска Мікалаеўшчына за гады совецкай улады, а землякі народнага паэта зажылі шчаслівым і культурным жыццём.

Партыя і совецкая ўлада праяўляюць вялікія клопаты аб совецкім сялянстве. У Мікалаеўшчыне пабудавана сярэдняя школа імя Якуба Коласа, больніца, бібліятэка, радыёвузел, паштовае аддзяленне, магазіны. Для самых малых жыхароў Мікалаеўшчыны пабудаваны дзіцячыя яслі.

Частым госцем у вёсцы з'яўляецца кінаперасоўка.

Змянілася аблічча Мікалаеўшчыны, змяніліся і людзі. Адышлі ў нябыт цемра і непісьменнасць. У вёсцы жыве і працуе значны атрад совецкай інтэлігенцыі — урачы, настаўнікі, аграномы.

Свае веды інтэлігенцыя аддае народу. Настаўнікі, урачы, спецыялісты сельскай гаспадаркі часта выступаюць з лекцыямі, дакладамі, праводзяць гутаркі на самыя разнастайныя тэмы. І не было выпадку, каб гэтыя лекцыі не збіралі вялікую аўдыторыю.

У гэтым годзе 7 калгасаў Мікалаеўскага сельсавета аб'ядналіся ў адну сельскагаспадарчую арцель «Радзіма Якуба Коласа». Перад калгаснікамі адкрыліся новыя перспектывы, новыя магчымасці ў стварэнні заможнага і культурнага жыцця.

У хуткім часе ажыццёвіцца мара калгаснікаў — будзе пабудавана гідрастанцыя, якая запаліць у хатах Мікалаеўшчыны лямпачкі Ільіча, дасць электраэнергію калгаснай вытворчасці.

Сённешнія пачуцці жыхароў Мікалаеўшчыны выказаў наш вялікі земляк Якуб Колас:

Я вітаю вялікі, шырокі разгон
Нашых дзён маладых,
Гоман творчасці іх...
Дык ярчэй-жа гары, сонца радасных дзён!

**А. РЫБАК.**

Вёска Мікалаеўшчына,
Стаўбцоўскі раён
Баранавіцкай вобласці.

## Стваральнікі машын

Здаецца, сюды не пранікае імклівае, напружанае заводскае жыццё. У светлых пакоях канструктарскага бюро не чуваць вытворчага шуму, толькі шорах рэйсшын па лістах ватмана парушае цішыню. Але ў сапраўднасці — тут адзін з жыццёва важных цэнтраў вытворчасці, дзе нараджаюцца канструкцыі новых сельскагаспадарчых машын.

Тысячы саломасіласарэзак РСС — 6,0, якія створаны на «Гомсельмашы», працуюць у калгасах краіны. З Карэла-Фінскай ССР і з рэспублік Прыбалтыкі, Украіны і Казахстана, Малдавіі і Урала на завод прыходзяць пісьмы ад працаўнікоў сельскай гаспадаркі са шчырай падзякай калектыву за стварэнне гэтай машыны.

Цікавы праект падвеснай дарогі для жывёлагадоўчых ферм распрацаваў канструктар т. Бажак.

Нядаўна на лугах Казахстанскай занальнай машынавыпрабавальнай станцыі з'явілася новая машына, сканструяваная інжынерам «Гомсельмаша» Б. Басам. Увесь яе механізм размешчаны ў спецыяльным фургоне. Гэта—даільная ўстаноўка, абсталяваная вакуумнасосам, даільнай апаратурай, рухавіком унутранага згарання, падагравальнікам вады і ахаладжальнікам малака.

Да гэтага часу не механізаваны працэс раскідвання ўгнаенняў на калгасных палях. Над гэтай праблемай працуе інжынер Графімук. Хутка на палях з'явіцца сканструяваны ім раскідвальнік угнаенняў.

Канструкцыю змясіцеля арганічных і мінеральных угнаенняў распрацавалі канструктары Сімакоў і Місінкаў.

Многа каштоўных думак падказаў канструктарам завода трохгадовы план развіцця грамадскай жывёлагадоўлі. На ўзбраенне социялістычнай сельскай гаспадаркі паступаюць перасоўны кормазапарачны агрэгат, корнеклубнемыйка, бульбамяшалка, аўтавадакачка і інш.

Вялікае значэнне будзе мець распрацаваная т.т. Стукалавым, Журко і Бажаком канструкцыя кормапрыгатавальнага агрэгата. Апарат робіць пагрузку кармоў у машыну, мыццё і цеплавую іх апрацоўку, змешванне і разгрузку на месцы спажывання. Прадукцыйнасць агрэгата — больш тоны ў гадзіну.

**В. СЯМЕНАЎ.**

Завод «Гомсельмаш».

## Прыём у мастацкія навучальныя ўстановы

Пачаўся прыём студэнтаў у мастацкія навучальныя ўстановы рэспублікі. Прыёмныя камісіі атрымалі вялікую колькасць заяў.

У Беларускі тэатральны інстытут падалі заявы 92 чалавекі.

Перад прыёмам студэнтаў інстытут арганізаваў сустрэчы актораў тэатра оперы і балета, тэатра імя Янкі Купалы, рускага драматычнага тэатра БССР з выпускнікамі дзесятых класаў сярэдніх школ горада Мінска, Мінскай і Гродзенскай абласцей, а таксама вечары «адкрытых дзвярэй».

Добра арганізавана падрыхтоўка да прыёму студэнтаў у Мінскае музычнае вучылішча. На 30 вакантных месц пададзена 167 заяў. У рэспубліканскае мастацкае вучылішча на 15 месц пададзена 150 заяў.

У вучылішчы да ўступных экзаменаў адкрыты дзве мастацкія выстаўкі, на якіх экспануюцца дыпломныя работы студэнтаў-выпускнікоў мінулага навучальнага года і работы, выкананыя паступаючымі.

У Беларускую дзяржаўную кансерваторыю пададзена 50 заяў.

## Гарадскі агляд мастацкай самадзейнасці

Мінскі гарадскі Совет дэпутатаў працоўных і бюро гаркома КП(б)Б прынялі пастанову аб правядзенні з 1-га верасня па 1-е лістапада ў Мінску агляду мастацкай самадзейнасці.

Старшынёй камісіі па правядзенню агляду зацверджаны сакратар гарадскога камітэта КП(б)Б Л. Лубеннікаў. У склад аргкамітэта ўваходзяць артысты І. Ждановіч, А. Кістаў, кампазітар Р. Пукст, дырэктар Мінскага музычнага вучылішча Н. Юшкевіч і інш.

Для аказання практычнай дапамогі па падрыхтоўцы да правядзення агляду ў заводскіх і фабрычных калектывах, а таксама ў мастацкіх калектывах навучальных устаноў прыцягнуты артысты тэатра оперы і балета, драматычнага тэатра імя Янкі Купалы і Беларускай дзяржаўнай філармоніі.

# СЛОВА НАШЫХ СЯБРОЎ

Споўнілася дванаццаць гадоў з таго памятнага часу, калі народы Прыбалтыкі — Літвы, Латвіі, Эстоніі — вызваліліся з ланцугоў капітала і далучыліся да вялікага Совецкага Саюза.

Роўныя сярод роўных, Латвійская, Літоўская, Эстонская Совецкія Сацыялістычныя Рэспублікі жывуць сёння сонечным шчаслівым жыццём.

Расквітнела культура вольных народаў Літвы, Латвіі, Эстоніі.

У гэтыя дні літоўскія пісьменнікі, артысты, мастакі, кампазітары дзейсна рыхтуюцца да важнай падзеі ў культурным жыцці рэспублікі — да дэкады літоўскай літаратуры і мастацтва ў Маскве.

Пра літаратуру Совецкай Літвы расказвае друкуемая намі старонка.

Антанас ВЕНЦЛОВА

## Партыя

Ты нас любіць Радзіму навучыла,
Яе народ, яе вялікі люд,
Сталёвыя рады магутнай сілы,
Блакіты неба і заводаў гуд.
Ты прывяла на светлы шлях свабоды
І навучыла нас ісці па ім
І ненавідзець ворагаў народа,
Іх цёмную хлусню з каварствам злым,
О, Партыя!

Вучыла цэглу класці працавіта,
Каб высіўся будынкаў дзіўных строй,
Каб шчасце, працы нашае здабытак,
Як ранак, ззяла яснай чысцінёй.
Ты навучала шанаваць багацтва —
Вялікіх розумаў і сэрцаў плён.
І лепшы скарб навукі і мастацтва
Мы ўзялі ў спадчыну для нашых дзён,
О, Партыя!

Ты нас вяла шырокім ратным полем,
Урошаным крывёй тваіх сыноў.
Мы не баімся куль, і мы ніколі
Не хілім перад ворагам галоў.
Закончыўшы паходы, над Берлінам
Мы палымяны сцяг узнялі свой.
Аб перамозе ведаюць краіны,
Яна гучыць, як песня над зямлёй,
О, Партыя!

Ты клікала ўзараць старыя межы,
І трактары прайшлі ад краю ў край,
Руйнуючы капцы; на ўсім бязмежжы
Шуміць цяпер калгасны ураджай.
У дружнай творчасці, у працы рупнай,
Нібы братоў, злучыла ты народ.
І нараджаецца ўжо дзень наступны —
Магутнасць наша, шчасце і пачот,
О, Партыя!

Ты з Сталіным пад сцягам ленінізма
Прайшла вялікі і славуты шлях.
Вядзі-ж народ да шчасця комунізма,
Як сталь, загартаваная ў баях!
Як маці на руках дзіця люляе,
Найдаражэйшы скарб любімы свой,
Так наш народ сягоння мір трымае
Руплівою работаю сваёй,
О, Партыя!

Пераклаў Пятро ГЛЕБКА.

## Перад вялікім экзаменам

Увесь літоўскі народ, асабліва яго творчая інтэлігенцыя, з вялікай радасцю сустрэлі рашэнне партыі і ўрада аб правядзенні ў гэтым годзе ў Маскве дэкады літоўскай літаратуры і мастацтва. Гэта—вялікая чэсць і вялікае прызнанне літоўскай літаратуры і мастацтва, але разам з тым і вялікі экзамен, які патрабуе напружання ўсіх творчых сіл.

Новае жыццё, сталінская дружба народаў вывелі літоўскую літаратуру на шырокую дарогу.

Літоўская літаратура стала неад'емнай часткай самай перадавой, самай таленавітай літаратуры ў свеце — совецкай літаратуры. Ніхто і ніколі не марыў, што лепшыя творы літоўскіх пісьменнікаў калі-небудзь дачакаюцца такой велізарнай аўдыторыі чытачоў, якую яны маюць цяпер. Творы К. Данелайціса і І. Жэмайтэ, П. Цвіркі, С. Нерыс і многіх другіх нашых пісьменнікаў, перакладзеныя на рускую мову, атрымалі пашпарт у сусветную літаратуру.

Літоўскія совецкія пісьменнікі за час свабоднага жыцця дасягнулі значных поспехаў. Самыя лепшыя творы — выбраныя творы С. Нерыс, паэма Т. Тыльвіціса «На зямлі літоўскай», кніга выбранай паэзіі А. Венцловы, раман А. Гудайціса-Гузявічуса «Праўда каваля Ігнотаса» былі адзначаны Сталінскімі прэміямі.

Літоўскія совецкія пісьменнікі, рыхтуючыся да дэкады, ажывілі сваю творчую дзейнасць. Вялікая ўвага звернута на падрыхтоўку да выдання твораў літоўскіх пісьменнікаў на рускай мове. У сувязі з дэкадай у маскоўскіх выдавецтвах і ў выдавецтве мастацкай літаратуры Літоўскай ССР павінны быць выпушчаны на рускай мове дзесяткі кніг, большасць якіх — новыя творы нашых совецкіх пісьменнікаў. З класікаў выдадзены двухтомнік твораў І. Жэмайтэ і зборнік апавяданняў І. Білюнаса. Першы раз на рускай мове друкуецца раман Петраса Цвіркі «Франк Крук».

Дзяржлітвыдавецтва СССР запланавала зборнік совецкай паэзіі першага літоўскага пролетарскага паэта Ю. Яноніса, зборнікі твораў С. Нерыс, Т. Тыльвіціса і А. Венцловы, а таксама раман П. Цвіркі «Зямля-карміліца». Выдавецтва «Совецкі пісьменнік» плануе выданне зборніка апавяданняў совецкай літоўскай прозы, новы пераклад рамана «Праўда каваля Ігнотаса», зборнікі паэзіі В. Рэймерыса і В. Мазурунаса і зборнік апавяданняў І. Балтушыса. Дзіцячае выдавецтва выпускае зборнік літоўскіх народных казак, зборнік апавяданняў Г. Карсакене, зборнікі вершаў для дзяцей Э. Межэлайціса і В. Вальсюнене. Выдавецтва «Маладая гвардыя» запланавала выданне некалькіх зборнікаў паэтычных і празаічных твораў маладых літоўскіх пісьменнікаў.

У Вільнюсе выдаюцца на рускай мове новыя творы нашых пісьменнікаў. У першую чаргу, трэба адзначыць раман класіка літоўскай літаратуры Антанаса Веналіса-Жукаўскаса «Маёнтак Паджунасаў», у якім аўтар таленавіта адлюстроўвае вострую класавую барацьбу на вёсцы ў буржуазнай Літве. Падзеі рамана заканчваюцца ажыццяўленнем совецкага ладу ў Літве ў 1940 годзе.

А. Гудайціс-Гузявічус напісаў новы раман «Браты» — працяг свайго рамана «Праўда каваля Ігнотаса», дзе паказвае, як пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі літоўскі народ змагаецца за совецкую ўладу ў 1919 годзе, супраць літоўскай рэакцыі і англа-амерыканскіх імперыялістаў, якія дапамагалі літоўскай буржуазіі ўстанавіць у Літве сваю дыктатуру.

На літоўскай і рускай мовах будзе выдадзена паэма В. Вальсюнене «Веранька», якая адлюстроўвае актыўны ўдзел жанчыны ў калгасным будаўніцтве. Выйдуць таксама зборнікі новых паэтычных твораў Т. Тыльвіціса, Э. Межэлайціса, К. Корсакаса, В. Мазурунаса, А. Жукаўскаса. Першы раз на літоўскай мове выйдзе зборнік выбранай паэзіі В. Монтвілы.

Літоўскія совецкія драматургі: І. Балтушыс, А. Грыцюс, І. Марцінкявічус і І. Паукшцяліс працуюць над новымі п'есамі, лепшыя з якіх увойдуць у тэатральны рэпертуар да дэкады. І. Балтушыс ужо напісаў п'есу «Рана раннем» з жыцця калгаснікаў Совецкай Літвы, якую ставіць рэспубліканскі драматычны тэатр Літоўскай ССР у Вільнюсе.

Дэкада літаратуры і мастацтва ў Маскве — гэта свята літоўскага народа, дэманстрацыя яго творчых поспехаў.

Літоўскія совецкія пісьменнікі рыхтуюцца правесці ў рэспубліцы дэкадныя літаратурныя вечары, у час якіх яны пазнаёмяць чытачоў з новымі творамі. У канцы лета будуць арганізаваны абмеркаванні выдадзеных твораў у рабочых калектывах, сярод калгаснікаў і вучняў школ.

Цяпер уся наша ўвага накіравана на тое, каб апраўдаць аказанае нам давер'е, каб з чэсцю вытрымаць вялікі экзамен. Для гэтага ў пісьменнікаў Совецкай Літвы ёсць усе магчымасці.

І. ШЫМКУС,
старшыня ССП Літвы.

## Незакранутыя тэмы

Дэкада літоўскай літаратуры і мастацтва, якая адбудзецца ў Маскве ўвосень гэтага года, пакажа значныя дасягненні літоўскай совецкай літаратуры за апошнія гады. Адной са станоўчых рыс нашай літаратуры з'яўляецца тое, што яна была актуальнай і баявой. Літоўскія совецкія пісьменнікі правільна зразумелі патрабаванні, пастаўленыя новым жыццём, і актыўна ўключыліся ў пабудову комунізма ў нашай краіне. Гістарычныя пастановы ЦК ВКП(б) і ЦК КП(б) Літвы па ідэалагічных пытаннях, геніяльныя працы І. В. Сталіна ў галіне мовазнаўства дапамаглі ўзняць ідэйна-палітычны і мастацкі ўзровень літоўскай совецкай літаратуры. Барацьба з буржуазнымі нацыяналістамі, стваральная праца ў вёсцы і горадзе, перавага калгаснага ладу, фармаванне совецкага чалавека, рост ролі жанчыны ў совецкім жыцці, развіццё і выхаванне дзяцей, выкрыццё клерыкалізма, паказ дружбы народаў, пачуццяў совецкага патрыятызма — вось тыя галоўныя тэмы, якія вырашае совецкая літоўская літаратура.

Матэрыял для вырашэння гэтых тэм літоўскія пісьменнікі дагэтуль бралі найбольш з сучаснага жыцця, або з вельмі недалёкага мінулага — апошняга дзесяцігоддзя жыцця Літвы. Некалькі далейшае мінулае — барацьбу літоўскага народа за совецкую ўладу пасля першай імперыялістычнай вайны — адлюстроўвае А. Гудайціс-Гузявічус у сваіх раманах «Праўда каваля Ігнотаса», адзначанага Сталінскай прэміяй, і «Браты». Выкрыццю кулакоў-памешчыкаў у буржуазнай Літве прысвечаны раман А. Веналіса-Жукаўскаса «Маёнтак Паджунасаў», які нядаўна выйшаў з друку. Жыццё буржуазнай Літвы часткова закранае і лаўрэат Сталінскай прэміі Т. Тыльвіціс у сваёй паэме «На зямлі літоўскай». Калі яшчэ дадаць п'есы І. Балтушыса — «Пяюць пеўні» і А. Грыцюса — «Канец кладкі», у якіх фонам дзеянняў з'яўляецца вёска буржуазнай Літвы, дык мы пералічым амаль усе творы літоўскай совецкай літаратуры, якія паказваюць мінулае. Названыя творы хоць часткова і раскрываюць мінулае жыццё літоўскага народа і яго барацьбу за светлую будучыню, усё-ж далёка не ўсебакова паказваюць жыццё народа, не адлюстроўваюць яго імкненняў. Гэта-ж можна сказаць і аб паказе класавага эксплааататарскага характару буржуазіі.

Горшае становішча ў літоўскай совецкай літаратуры з гістарычнымі тэмамі. Яшчэ і сёння мы не маем ніводнага твора, які-б адлюстроўваў жыццё народа ў феадальнай Літве, у Літве XIX і пачатку XX стагоддзяў.

Буржуазныя пісьменнікі ідэалізавалі жыццё феадальнай Літвы, безапеляцыйна ўзвышалі яе правадыроў і іх заваёвы, замоўчвалі страшэнны прыгнёт працоўнага народа і тым самым імкнуліся замаскіраваць класавыя супярэчнасці эпохі капіталізма. Акрамя таго, гістарычная тэма для буржуазных пісьменнікаў была невычэрпнай крыніцай узбуджэння буржуазнага нацыяналізма. Задача совецкіх пісьменнікаў — даць правільны паказ мінулага свайго народа.

У раманах А. Гудайціса - Гузявічуса адлюстравана барацьба народа за совецкую ўладу. Гэтая барацьба, якая закончылася ў 1940 годзе перамогай, мае глыбокія традыцыі ў мінулым Літвы.

Каб вырваць пустазелле нацыяналістычнага шавінізма, совецкія пісьменнікі павінны ўзяць з гісторыі Літвы такія тэмы, якія будуць выхоўваць пачуццё дружбы паміж літоўцамі, беларусамі, рускімі, украінцамі, палякамі.

Такіх момантаў і ў літоўскай і ў беларускай гісторыі пісьменнік знойдзе нямала. Адным з такіх момантаў з'яўляецца паўстанне Кастуся Каліноўскага ў 1863 годзе.

У гісторыі літоўскага культурнага і літаратурнага жыцця былі незвычайныя людзі, дзейнасць і жыццё якіх можа даць цікавыя тэмы. Досыць успомніць цудоўнага паэта-рэаліста XVIII стагоддзя К. Данелайціса — аўтара вядомай паэмы «Гады», або некалькі пазнейшага песняра прыгонных сялян А. Страсдаса, або, нарэшце, народную пісьменніцу І. Жэмайтэ, якая пражыла вялікае і разнастайнае жыццё ад 1845 да 1921 года.

Совецкія літоўскія пісьменнікі ідуць разам з жыццём. Яны ведаюць, што найбольшых вынікаў дасягае літаратура тады, калі яна адлюстроўвае сучаснае жыццё. Думаючы аб дэкадзе, прыгадваючы некалькі важных, дагэтуль не закранутых тэм, я хацеў выказаць пажаданне, каб наша совецкая літаратура не аддалялася ад пастаўленых перад ёю задач і разам з тым узнімала некаторыя актуальныя тэмы мінулага. Я закранаю гэтае пытанне, бо ўпэўнены, што распрацоўка некаторых з гэтых тэм яшчэ больш умацуе брацкія сувязі паміж нашымі народамі, якія ў мінулым разам пакутвалі і змагаліся за светлую будучыню.

В. МІКАЛАЙЦІС-ПУЦІНАС.

Сустрэча П. Цвіркі з Я. Купалам у Каўнасе ў 1941 г.
Карціна мастака Л. Сургайліса.

В. РЭЙМЕРЫС

## Вясна на плошчы Чарняхоўскага

Зноў усюды вясна.
Яркім сонцам заліты
Ты, цудоўны наш Вільнюс,
У майскія дні,
І між ліп у цяньку,
Пад нябесным блакітам,
Маці дзецьмі любуюцца
У цішыні.

Чысты ранак,
Па вуліцах водыр разліты,
Ад шпакоў і дзятвы
Шум на цэлы квартал.
Рады мірнай вясне,
Ім у бітвах здабытай,
З вежы танка глядзіць
Несмяротны герой-генерал.

І раптоўна скрозь шум,
Поўны радасці, ласкі,
Голас маці —
Прыемна жаночым вачам —
Першы крок
Самастойна сынок ад калёскі,
Хоць нацвёрды той крок,
А зрабіў ужо сам.

І ці сонца прамень,
Ці на самай мо' справе
Генерал усміхнуўся,
Нібы незнарок,
Потым строгі такі
Ён з біноклем стаяў велічна —
Мо' аб сыне тым дбаў,
Што зрабіў першы крок.

І нібы гаварыў ён
Паглядам, істотай сваёю:
Добра ў нашай краіне
Пачынаць свае крокі ў жыцці...
Не дазволяць нікому
Тут змішчаць нас напалам, чуйна —
Звяжуць рукі забойцам.
Будуць дзеці спакойна расці.

Пераклаў А. БАЧЫЛА.

## Шчасце вольных людзей

У буржуазнай Літве я шмат год быў батраком, перанёс бяспраўную долю пайміта. Сёння я выразна бачу, якім светлым і шчаслівым жыццём жывуць працаўныя сяляне, што скінулі ярмо кулацтва і аб'ядналіся ў калгасы.

Нараджэнню новага совецкага чалавека ва ўмовах калектыўнай працы я прысвячаю сваю п'есу «Рана раннем», якая будзе ўключана ў дэкадны рэпертуар Дзяржаўнага драматычнага тэатра Літоўскай ССР. Я імкнуся паказаць адну з перадавых жанчын, якая ўжо даўно ўступіла ў калгас і выбрана старшынёй. Яна добра кіруе калгасам, дабілася немалых поспехаў, аднак няўмелае думаць у шырокім маштабе, вузасць кругагляду перашкаджаюць ёй ажыццяўляць у калгасе мерапрыемствы, якія рэкамендуе перадавая совецкая агранавука. Паралельна ў п'есе вырашаецца і праблема совецкай сям'і.

Толькі дзякуючы совецкай уладзе і клопатам большэвіцкай партыі я — ў мінулым непісьменны батрак — атрымаў магчымасці для сваёй працы. Мая п'еса, як і ўсіх совецкіх пісьменнікаў, — выхоўваць народ у духу комунізма, змагацца за трывалы мір на зямлі, за канчатковую перамогу комунізма.

І. БАЛТУШЫС.

## Шматвяковая дружба

Костас КОРСАКАС

Усё больш мацнее дружба паміж брацкімі народамі—беларускім і літоўскім. Гэтую дружбу ўзмацняе агульная праца нашых народаў, накіраваная на пабудову комунізма, на ўмацаванне міру, на шчасце і добрабыт усіх совецкіх людзей.

Сацыялістычная дружба, якая сёння квітнее паміж працоўнымі Беларусі і Літвы, з'яўляецца тым больш моцнай таму, што яна мае глыбокія гістарычныя карэнні, што паміж беларускім і літоўскім народамі існуе шматвяковая культурная сувязь.

Беларускі народ зрабіў вялікі ўклад у культурнае развіццё літоўскага народа. Літоўцы заўсёды з удзячнасцю ўспамінаюць той факт, што беларусы далі літоўцам пачатак пісьменнасці. Пачынаючы з XIV стагоддзя ўсё пісалася на той мове, на базе якой пазней развілася цяперашняя беларуская мова. Гэтая мова была дзяржаўнай мовай у Літве аж да канца XVIII стагоддзя.

Літоўская сталіца Вільня на працягу доўгіх стагоддзяў была і культурным цэнтрам беларусаў. У Вільні вядомы дзеяч беларускай культуры Георгій Скарына друкаваў свае кніжкі, і гэта мела вялікае значэнне для развіцця як беларускай, так і літоўскай культуры. Думкі Георгія Скарыны аб значэнні роднай мовы, аб патрэбе даць народу кнігі на роднай мове знайшлі адбітак у творах значнага ў той час літоўскага пісьменніка М. Даўкшы, якія таксама друкаваліся ў Вільні.

Беларускі і літоўскі народы перажывалі агульны перыяд культурнага заняпаду, калі народныя масы абодвух народаў цярпелі жорсткі прыгнёт, калі іх нацыянальныя мовы праследваліся польскімі і апалячанымі феадаламі. Беларускія і літоўскія масы прыгонных сялян тады не раз паўставалі на барацьбу з феадальным прыгнётам, удзельнічалі ў агульных паўстаннях супраць паноў.

У час паўстання 1863 года яшчэ раз праявілася глыбокая дружба беларускага і літоўскага народаў. Народныя масы абодвух краін сталі на рашучую барацьбу супраць царызма і памешчыкаў, за зямлю і волю, за светлае заўтра. «Мужыцкая праўда», якую выдаваў лепшы сын беларускага народа К. Каліноўскі, знайшла водгук у сэрцах літоўскіх сялян.

Плячо ў плячо з К. Каліноўскім змагаліся правадыры паўстання ў Літве, паслядоўнікі рускіх дэмакратаў — З. Сіракоўскі і І. Мацкевічус.

Вядомы беларускі паэт, удзельнік паўстання 1863 года, дэмакрат Ф. Багушэвіч доўгія гады жыў у Вільні і добра бачыў цяжкае становішча як беларускага, так і літоўскага народа. У яго паэзіі, якая прапагандавала народныя дэмакратычныя ідэі, адлюстраваны і тагачасны лёс літоўскіх народных мас.

Калі ў канцы XIX стагоддзя пачынаецца рух рэволюцыйнага класа — пролетарыята, працоўныя Беларусі і Літвы ўключаюцца ў агульную вызваленчую барацьбу, рэволюцыйныя ідэі Леніна — Сталіна становяцца іх агульным сцягам. Рэволюцыя 1905 года цесна злучае працоўных Мінска і Вільнюса, Каунаса і Гродна, Віцебска і Шауляя, якія ідуць за гераічным пролетарыятам Петраграда і Масквы. Тады ўзнікаюць традыцыі рэволюцыйнага супрацоўніцтва рабочага класа Беларусі і Літвы, якія яшчэ больш мацнеюць у агульнай барацьбе.

Новая беларуская літаратура, якая адлюстроўвае рэволюцыйны рух народных мас, цесна звязана з Літвой. Вядомая беларуская паэтэса-рэволюцыянерка Цётка некаторы час жыла і працавала ў Вільні. У Вільні выдаваліся першыя беларускія газеты «Наша доля» і «Наша ніва», вакол якіх гуртаваліся значныя сілы беларускага культурнага руху, сярод іх — заснавальнікі навейшай беларускай літаратуры вялікія паэты Янка Купала і Якуб Колас. Жывучы ў Вільні, яны напісалі рад выдатных твораў, у якіх да некаторай ступені адбіваецца цяжкая доля і літоўскіх працоўных у час панавання царызма і капіталізма. Першы зборнік вершаў Якуба Коласа «Песні жальбы» выйшаў у Вільні ў 1910 годзе; у 1913 годзе ў Вільні была пастаўлена п'еса Янкі Купалы «Паўлінка». У Вільні нейкі час жыў і працаваў беларускі тэатральны дзеяч Ігнат Буйніцкі, а таксама Змітрок Бядуля.

Усё гэта спрыяла развіццю цеснай сувязі паміж беларускімі і літоўскімі культурнымі дзеячамі. У той час Янка Купала пасябраваў з літоўскім народным паэтам Людасам Гірам, з літоўскім кампазітарам Стасісам Шымкусам, удзельнічаў у культурнай рабоце літоўскага клуба «Рута». Л. Гіра пераклаў першыя вершы Янкі Купалы на літоўскую мову, а С. Шымкус напісаў музыку на некаторыя купалаўскія вершы. Кульмінацыйным момантам гістарычнага супрацоўніцтва беларускага і літоўскага народаў была агульная барацьба ў 1918—1919 г.г. за совецкую ўладу, за ажыццяўленне перамог Кастрычніцкай рэволюцыі ў Беларусі і Літве. Агульны для абодвух рэспублік совецкі ўрад, на чале якога стаяў вядомы літоўскі рэволюцыянер-большэвік В. Міцкевічус-Капсукас, кіраваў тады гераічнай барацьбой працоўных мас абодвух народаў за звяржэнне капіталізма, за ажыццяўленне ідэй Леніна — Сталіна.

Беларускі народ пры дапамозе вялікага рускага народа і другіх совецкіх народаў дасягнуў перамогі сацыялізма ў сваёй роднай краіне. Літоўскі народ, на які напалі амерыкана-англійскія інтэрвенты і здрадніцкая літоўская буржуазія, часова апынуўся ў імперыялістычнай і фашысцкай няволі. Аднак праз увесь час крывавага панавання літоўскай буржуазіі працоўныя Літвы заўсёды памяталі пра тыя светлыя гады, калі яны разам з беларусамі ішлі агульнай дарогай, якую вызначылі Ленін і Сталін. Літоўскі народ з велізарнай увагай сачыў за велічнымі поспехамі краіны сацыялізма і чакаў магчымасці, каб скінуць панаванне буржуазіі і пабудаваць у Літве сацыялізм.

Гэта адбылося ў незабыўным 1940 годзе. Ад гэтай гістарычнай даты лёс літоўскага народа стаў навекі злучаным з лёсам брацкага беларускага народа, з лёсам вялікага рускага народа і іншых совецкіх народаў у вялікай дзяржаве сацыялізма.

Ужо ў 1940 - 41 г.г. зноў было адноўлена культурнае супрацоўніцтва паміж беларускім і літоўскім народамі. У гэтым годзе ў совецкую Вільню наведаўся Янка Купала з Якубам Коласам і іншымі дзеячамі беларускай культуры, а ў Мінск прыехаў вядомы літоўскі пісьменнік Петрас Цвірка. Совецкая ўлада адкрыла шырокія перспектывы для супрацоўніцтва паміж двума суседнімі рэспублікамі.

Сёння нашы брацкія народы цесна супрацоўнічаюць у пабудове комунізма. Працоўныя нашых рэспублік абменьваюцца паміж сабой вытворчым вопытам, літоўскія калгаснікі вучацца ў беларускіх калгаснікаў, як дасягнуць высокіх ураджаяў, разам будуюць гідраэлектрастанцыю на возеры Дрысвяты. Універсітэты Вільнюса і Мінска завязалі цесную сувязь. Штодзень пашыраецца і паглыбляецца творчая дружба паміж пісьменнікамі нашых рэспублік, мастакамі, вучонымі. Лепшыя творы беларускіх пісьменнікаў перакладаюцца на літоўскую мову. У 1950 годзе ў Вільнюсе была выдадзена «Анталогія беларускай прозы», а ў 1952 годзе — «Анталогія беларускай паэзіі». Яскравым прыкладам культурнага супрацоўніцтва і дружбы нашых народаў было ўрачыстае адзначэнне ў Совецкай Літве 70-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы.

Трэба ад усяго сэрца пажадаць, каб гэтая брацкая сувязь, якая мае шматвяковыя традыцыі, яшчэ больш пашыралася і паглыблялася. Вельмі пажадана, каб у Мінску, у Вільнюсе і ў іншых беларускіх і літоўскіх гарадах адбываліся як мага часцей агульныя літаратурныя вечары нашых пісьменнікаў, гастролі тэатраў, мастацкія выстаўкі.

Трэба спадзявацца, што ўжо ў бліжэйшы час нашы пісьменнікі напішуць творы, у якіх будзе адлюстравана шматвяковая дружба беларускага і літоўскага народаў і тое новае супрацоўніцтва сталінскай эпохі, дзякуючы якому нашы народы жывуць у вялікай сям'і совецкіх народаў, як два шчаслівыя браты.

## Кнігі да дэкады

Дзякуючы кіраўніцтву і клопатам большэвіцкай партыі літоўская совецкая літаратура дасягнула значных поспехаў. Лепшыя творы нашых пісьменнікаў атрымалі ў народзе вялікую папулярнасць. Яны перакладзены на рускую мову і на мовы іншых брацкіх народаў і народаў дэмакратычных краін.

У сувязі з дэкадай толькі на рускай мове будзе выдадзена каля 80 кніг, сярод якіх: вялікі том апавяданняў класіка літоўскай літаратуры І. Жэмайтэ, кніга І. Білюнаса «Першая забастоўка», двухтомнік твораў П. Цвіркі. Здадзены ў друк вялікі раман у трох тамах А. Гудайціса-Гузявічуса «Браты», які адлюстроўвае барацьбу літоўскага народа за совецкую ўладу ў 1919-20 гг. На рускай мове выдаюцца апавяданні І. Шымкуса, М. Слуцкіса, І. Давідайціса, І. Авіжуса і інш.

У сувязі з дэкадай у рэспубліцы выйдзе значная колькасць паэтычных твораў: кніга вершаў лаўрэата Сталінскай прэміі А. Венцловы «Выбранае», Т. Тыльвіціса «Рака міру» — аб вялікіх будоўлях комунізма, С. Нерыс «Паэма аб Сталіне» і кніга літоўскага народнага паэта Л. Гіры «Выбранае», а таксама том паэзіі В. Монтвілы, які быў закатаваны гітлераўскімі акупантамі.

З класікаў літоўскай літаратуры выпускаецца «Выбранае» рэволюцыйнага паэта Ю. Яноніса. Выйдуць таксама кнігі К. Корсакаса, В. Мазурунаса, Э. Межэлайціса, В. Вальсюнене і іншых паэтаў.

Апрача таго, выдаецца рад кніг для дзяцей і моладзі: І. Жэмайтэ, К. Бінкіса, В. Рэймерыса, Э. Межэлайціса і інш.

Вялікую дапамогу аказваюць нам рускія пісьменнікі. Яны перакладаюць, рэдагуюць літоўскія літаратурныя творы.

Афармляюць дэкадныя выданні лепшыя літоўскія графікі Гальдыкас, Тарабільдэне, Тулене, Кузьмінскас і іншыя.

Да дэкады чытач атрымае каля ста назваў кніг.

Альбінас ЖУКАЎСКАС,
галоўны рэдактар выдавецтва мастацкай літаратуры Літоўскай ССР.

## Творы літоўскіх пісьменнікаў на рускай мове

Для азнаямлення рускага чытача з творчасцю пісьменнікаў Совецкай Літвы да дэкады літоўскай літаратуры і мастацтва ў Маскве ў выдавецтвах сталіцы выйдуць творы літоўскіх пісьменнікаў у перакладзе на рускую мову.

У Дзяржлітвыдавецтве выпускаецца «Анталогія літоўскай совецкай паэзіі», выбраныя вершы С. Нерыс, «Выбранае» А. Венцловы і «Выбранае» Т. Тыльвіціса.

Выдавецтва «Совецкі пісьменнік» друкуе зборнік літоўскай совецкай прозы, кнігу апавяданняў І. Балтушыса, зборнік вершаў В. Рэймерыса «Літоўская вясна» і «Вершы» В. Мазурунаса.

З творчасцю пісьменнікаў маладога пакалення пазнаёміць чытача выдавецтва «Маладая Гвардыя». Тут выйдзе зборнік твораў маладых літоўскіх пісьменнікаў, кніга вершаў А. Іонінаса, апавяданні А. Пакальніса і К. Марукаса. Будуць выдадзены таксама вершы аб моладзі В. Рэймерыса.

Зборнік апавяданняў літоўскіх пісьменнікаў для дзяцей, літоўскія народныя казкі, паэма для дзяцей В. Вальсюнене, апавяданні Г. Карсакене і вершы для дзяцей Э. Межэлайціса выйдуць у Дзіцячым дзяржаўным выдавецтве.

# Фільм-спектакль „Паўлінка“

★

А. ЗАРХІ,
пастаноўшчык фільма-спектакля «Паўлінка»

★

У апошні час на экранах часта дэманструюцца фільмы-спектаклі лепшых тэатраў краіны. Доўгі шлях ад МХАТ'а да Камчаткі, або ад плошчы Росі ў Ленінградзе, дзе стаіць тэатр імя Пушкіна, да ўскраін Поўначы. Гэты шлях поўнасцю пераадолены кінематографам. Зараз у самым аддаленым кутку Радзімы можна не толькі чуць выдатных майстроў тэатра, але і бачыць іх.

Жаданне пазнаёміцца з творчымі дасягненнямі тэатра, цікавасць да вечна жывой спадчыны класікаў вызначае поспех фільмаў-спектакляў у нашага гледача. Здавалася-б, якія далёкія ад нас, сучаснікаў будаўніцтва Волга-Дона, героі Льва Талстога, Астроўскага, Франко! Але глыбіня раскрыцця вобразаў у класічнай літаратуры ў спалучэнні з майстэрскім увасабленнем гэтых вобразаў лепшымі акторамі нашай краіны робяць герояў класічных твораў вечна жывымі. Вось чаму зусім заканамернай з'яўляецца пастаноўка фільма-спектакля па аднаму з лепшых класічных твораў беларускай драматургіі — камедыі Янкі Купалы «Паўлінка».

Шмат год спектакль «Паўлінка» з велізарным поспехам ідзе на сцэне тэатра імя Янкі Купалы. Гэтаму спектаклю спадарожнічаў нязменны поспех не толькі ў Беларусі, але і ў Маскве, Ленінградзе, на Украіне — усюды, куды выязджаў тэатр.

Героі «Паўлінкі» выпісаны настолькі трапна, настолькі жыццёва праўдзіва, што да іх з поўным правам можна аднесці словы Белінскага, сказаныя ім пра гогалеўскіх герояў: «гэта... кафтан, які так цудоўна скроены, што прыдзецца па плячу тысячы чалавек».

«Паўлінка», пастаўленая ў тэатры Я. Купалы (рэжысёр Л. Літвінаў), ператварылася ў яркі спектакль з цэлым радам буйных акторскіх удач. Але ўсё-ж у гледача ўзнікалі прэтэнзіі да тэатра, які празмерна захапіўся камедыйнымі элементамі п'есы ў шкоду яе соцыяльным матывам, у выніку чаго некалькі прыглушаны аказаўся і прагрэсіўны сэнс вобраза Якіма Сарокі.

Перад здымкамі фільма-спектакля «Паўлінка» вельмі важна было ўлічыць асобныя недахопы гэтай пастаноўкі ў тэатры з тым, каб выправіць іх на экране. Студыя «Беларусьфільм» запрасіла для напісання сцэнарнага плана фільма паэта Максіма Лужаніна.

Прыступаючы да экранізацыі спектакля «Паўлінка», нам хацелася знайсці ключ да яго кінематаграфічнага раскрыцця. Цяжкасці гэтай задачы заключаюцца ў тым, што трэба перанесці спектакль на экран, не разрываючы яго сцэнічную тканіну. Трэба так асцярожна карыстацца асаблівасцямі кінематографа, каб не парушыць форму спектакля ў цэлым і разам з тым надаць яму кінематаграфічную форму.

Законы тэатра і кіно ў многім розныя. Проста падмяніць сцэну экранам нам здаецца няправільным. З другога боку, груба ўторгнуцца са спецыфікай кінамастацтва на сцэну — гэта значыць неабдумана паламаць зладжаныя часткі спектакля, знішчыць яго цэласнасць і тым самым аслабіць яго ўражанне.

«Паўлінка» была напісана для перасоўнага народнага тэатра. Гэтым тлумачыцца і захаванне «адзінства месца». Уся п'еса іграецца ў адной дэкарацыі — у хаце Крыніцкага. Для перасоўнага тэатра — гэта неабходная ўмова. Для фільма-спектакля мы рашылі вынесці некаторыя эпізоды з хаты Крыніцкага, што, на нашу думку, не парушыць кампазіцыйнай стройнасці спектакля і разаб'е некаторую знешнюю аднатоннасць, шкодную для фільма.

У карціне, як і ў тэатры, мы ўводзім ролю вядучага. Яго задача — пазнаёміць гледача з эпохай, у якой адбываецца дзея, прадставіць удзельнікаў «Паўлінкі». Знаёмства з героямі мы пераносім на кірмаш. Кірмаш, абумоўлены рэмаркамі п'есы, узбагаціць фільм і не будзе выпадаць з агульнага стылю будучага фільма. Акрамя таго, кірмаш дасць магчымасць паказаць беларускае мястэчка таго часу і даць тым самым гледачу адчуванне часу.

На экраны краіны выходзяць фільмы-спектаклі, якія даўно ўжо іграюцца на сцэне, але зусім дарэмна ў некаторых з гэтых фільмаў забыты асновы акторскай ігры ў кіно. Кіно, як вядома, мае свае непарушныя законы акторскага майстэрства. Пры зусім аднолькавым пранікненні ў сутнасць вобраза, знешняя яго структура ў кіно некалькі другая, чым у тэатры. Кінаапарат, які стварае незвычайную блізкасць паміж гледачом і акторам, патрабуе надзвычайна тонкай акторскай ігры, глыбокай натуральнасці слова, стрыманай мімікі, дакладнасці жэста. Часта бывае так: тое, што добра і праўдзіва на сцэне, на экране выглядае найгрышам і фальшывасцю. Самы нязначны, непрыкметны са сцэны рух — на экране можа набыць значэнне спецыяльнага акцэнта.

Улічваючы некаторыя асаблівасці кіно, трэба ўлічыць і яго магчымасці. Так, напрыклад, у тэатры глядач бачыць адначасова ўсю сцэнічную пляцоўку. У кіно-ж, у пошуках найбольшага ўражання ад той ці іншай сцэны, неабходна фіксаваць увагу гледача толькі на самым важным у гэтай сцэне. Гэта патрабуе некаторай перабудовы мізансцэн. І ў фільме-спектаклі «Паўлінка» глядач, знаёмы са спектаклем у тэатры, не ўбачыць некаторых вядомых яму мізансцэн у тым плане, у якім яны зроблены ў тэатры.

Фільм-спектакль «Паўлінка» — першая спроба студыі «Беларусьфільм». Трэба думаць і спадзявацца, што гэтая спроба будзе не апошняй. Пастаноўка фільмаў такога жанра карысна яшчэ і таму, што тэатральным акторам, якія ўдзельнічаюць у такіх пастаноўках, лягчэй засвойваць кінематаграфічную спецыфіку акторскай ігры, таму што вобразы і матэрыял фільма для іх даўно знаёмыя і блізкія. Праўда, і тут ёсць свае цяжкасці: прыходзіцца часам змагацца з той «сцэнічнасцю», якая дарэчы на сцэне і зусім недарэчы на экране.

«Паўлінка» — першы фільм, які здымаецца студыяй «Беларусьфільм». І вельмі важна, што ў працэсе работы пачынае фарміравацца калектыў, які можа скарыстаць свой вопыт у наступных работах студыі. Студыя запрасіла для работы над фільмам «Паўлінка» кампазітараў Я. Цікоцкага і Ю. Бельзацкага, мастака Ганкіна, рэжысёраў П. Сушко і С. Бірылу. Здымае фільм аператар А. Гінцбург, з якім я здымаў фільмы «Член урада», «Яго завуць Сухэ Батор» і «Калгас «Рассвет».

У карціне заняты акторы тэатра імя Я. Купалы Г. П. Глебаў, Б. В. Платонаў, В. О. Дзядзюшка, Л. І. Ржэцкая, В. Н. Пола і другія.

У ролі Паўлінкі здымаецца маладая актрыса тэатра Л. Драздова.

Фільм-спектакль «Паўлінка» пазнаёміць гледачоў Совецкага Саюза з лепшымі акторамі аднаго з старэйшых тэатраў Беларусі, а таксама з лепшым творам беларускай класічнай драматургіі.

*Пісьмы ў рэдакцыю*

## Як „адпачываюць“ у Ашмянах

Дом адпачынку «Ашмяны» прызначаны, на думку Курортнага ўпраўлення БССР, для маці і дзіцяці. Сапраўды, у гэтым маляўнічым кутку можна было-б наладзіць добры адпачынак. Але, на жаль, сюды можа прыехаць не кожная маці, а толькі тая, у якой дзеці больш трохгадовага ўзросту.

Вы атрымалі пуцёўку, прыязджаеце ў Ашмяны з дзецьмі. Лета. Малым самы раз пабегаць, пазабаўляцца, пагуляць. Але гэта толькі пажаданні. На дварэ няма дзіцячай пляцоўкі, няма спецыяльнага пакоя для дзяцей. Няма дзе нават памыць дзіцяці, а таксама памыць яму вопратку.

У доме адпачынку ёсць выхавальніца і няня. Але яны не маюць свайго рабочага месца, не могуць належным чынам выконваць свае абавязкі.

10 ліпеня ў час лекцыі аб міжнародным становішчы мацеры ўвесь час выбягалі да дзяцей, якія гулялі на дварэ, а дзеці з крыкам прыбягалі да маці на лекцыю.

Дрэнна наладжана культурнае абслугоўванне адпачываючых. 12 ліпеня былі праданы білеты на кінафільм «Мірныя дні» (дарэчы, без штампа райфо). Фільм ішоў амаль без гуку. Нарэшце, пасля чацвертай часткі было аб'яўлена, што фільм далей дэманстравацца не будзе.

9 ліпеня павінны былі прыехаць артысты опернага тэатра, але канцэрт сарваўся з-за адсутнасці ў доме адпачынку раяля.

Ці ведае аб усім гэтым Курортнае ўпраўленне БССР?

С. ЦЯРЭШЧАНКА.

## Важная справа

Совецкія людзі любяць і паважаюць кнігу. У кожнай школе, хаце-чытальні, у многіх калгасах ёсць свае бібліятэкі. Мільёны кніг штодзённа знаходзяцца на руках у чытачоў.

Натуральна, што кнігі зношваюцца, асабліва «Раман-газета», часопісы і найбольш танныя масавыя выданні. У выніку кожная бібліятэка спісвае штогод на некалькі сот рублёў кніг, якія прышлі ў нягоднасць. Па рэспубліцы гэта складае мільёны рублёў. Такіх страт можна пазбегнуць, або, па меншай меры, значна іх скараціць, калі своечасова пераплятаць кнігі. Аднак пераплесці кнігу нават у раёне немагчыма, бо гэтай справай ніхто не займаецца.

Наспеў час стварыць у кожным раённым цэнтры пераплётныя майстэрні.

А. ІВАНЬКОЎ.

Жлобінскі раён.

# Залатыя рукі

УПРАСТОРНЫМ піонерскім пакоі Чаўскага дзіцячага дома можна ўбачыць шмат цікавых рэчаў, выробленых з дрэва. Высока падняўшы над галавой вострую бліскучую шаблю, імчыцца ў бой Чапаеў...

Ваза «Слава Сталіну — вялікаму пераўтваральніку совецкай зямлі».

У садзе на лавачцы сядзяць усесаюзны староста Міхаіл Іванавіч Калінін і вялікі пераўтваральнік прыроды Мічурын. Побач—бюст Андрэя Аляксандравіча Жданава.

Усё гэта, пачынаючы ад просценькага барэльефа ігрушы-бэры і канчаючы паўтарамятровай, па-мастацку аздобленай вазай, — зроблена рукамі юных рэзчыкаў па дрэву. Дзеці надалі кавалкам звычайнага дрэва строгія формы, удыхнулі ў іх жыццё, зрабілі творамі мастацтва.

— Майстэрства гурткоўцаў, — зазначае кіраўнік гуртка Грыгорый Фёдаравіч Самойлаў, — не прышло адразу. Яно здабыта ў выніку доўгай і крапатлівай работы.

Рабілася гэта так. Спачатку ляпіліся барэльефы з гліны, а потым па гэтых узорах выразаліся з дрэва формы. Працэс разьбы спадабаўся дзецям, і яны працавалі з захапленнем.

Першыя поспехі акрылілі іх. Яшчэ з большай настойлівасцю і ўпартасцю ўзяліся дзеці за авалодванне складанай тэхнікай разьбы.

Ужо летам 1949 года гурток удзельнічаў у Трэцяй рэспубліканскай выстаўцы дзіцячага самадзейнага мастацтва. Лепшымі работамі на гэтай выстаўцы былі барэльефы Леніна і Сталіна, Ленін на браневіку і фігура таварыша Сталіна. Апошнія дзве работы экспаніраваліся потым на Усесаюзнай выстаўцы дзіцячай творчасці ў Маскве.

Адной з важнейшых работ таго часу з'явілася ваза, прысвечаная 70-годдзю з дня нараджэння Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна. Разам з другімі падарункамі беларускага народа ваза была паслана ў Маскву. Цяпер яна знаходзіцца ў музеі падарункаў таварышу Сталіну.

Другой значнай калектыўнай работай гуртка была ваза, прысвечаная шостай гадавіне вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, падораная Совету Міністраў Беларускай ССР.

Вялікае месца ў творчасці гуртка займаюць вобразы правадыроў совецкага народа В. І. Леніна і І. В. Сталіна. З лепшых работ на гэтую тэму варта адзначыць барэльефы: «Ленін ля шалаша на станцыі Разліў», «Выступленне Леніна на Фінляндскім вакзале», «Маўзалей Леніна», «Сталін у Крэмлі», «Домік, дзе нарадзіўся Сталін», «Сталін на ваенным рубяжы пад Масквой».

Асаблівае захапленне выклікае калектыўная работа — ваза «Слава Сталіну — вялікаму пераўтваральніку совецкай зямлі». Вышыня вазы — 155 сантыметраў. Асновай для яе служыць пастамент, на якім ляжыць вянок з ігруш, яблыкаў, сліў, вінаграду. Ад вянка ўгору падымаюцца шэсць дубовых лістоў. На лістах умацаваны шасцігранник, на баках якога намаляваны Сталінградская і Куйбышэўская гідраэлектрастанцыі, Волга-Данскі суднаходны канал, Галоўны Туркменскі канал і інш. Увенчваецца ваза пышным снапом пшаніцы, між сцяблямі якой устаноўлены серп і молат. На пярэдняй частцы снапа ўмацаваны барэльеф вялікага пераўтваральніка прыроды — І. В. Сталіна, на адваротным баку — барэльеф сталінскага плана пераўтварэння прыроды.

Многія работы прысвечаны барацьбе совецкага народа за мір. Нікалай Палякоў выразаў скульптуру «Голуб міру».

Цікавыя работы Валянціна Валкавога «Барацьбіты за мір» і кампазіцыя «Мы за мір». Асновай кампазіцыі служыць шасцігранны пастамент, на гранях якога выразаны лаўровыя і пальмавыя лісты.

З другіх аб'ёмных работ вызначаюцца бюсты народнага паэта Беларусі Якуба Коласа і акадэміка Філатава.

Цікавы выпадак адбыўся з бюстам Філатава.

Чытаючы пра славутага акадэміка, дзеці рашылі зрабіць яго бюст. За гэтую справу ўзяўся самы лепшы гуртковец Н. Палякоў. Больш паўмесяца працаваў ён над бюстам. У Адэсу, у інстытут прафесара Філатава, ехаў на аперацыю інвалід Айчыннай вайны. Дзеці папрасілі яго адвезці бюст прафесару.

Прыехаўшы ў Адэсу, інвалід пайшоў у інстытут, каб выканаць просьбу дзетдомаўцаў. Але акадэмік у гэты час знаходзіўся ў Маскве, і бюст прышлося пакінуць у дырэктара інстытута.

Праз колькі дзён вучоны вярнуўся з Масквы. Зайшоўшы ў кабінет дырэктара, ён убачыў на стале свой партрэт і быў уражаны незвычайнай тонкасцю работы. Даведаўшыся, што гэта работа юных майстроў-дзетдомаўцаў, акадэмік усхвалявана сказаў: «Залатыя рукі ў гэтых рэбят». Акадэмік Філатаў у знак удзячнасці за прывоз падарунка сам зрабіў аперацыю хвораму інваліду.

Юныя рэзчыкі прынялі актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і правядзенні 100-годдзя з дня смерці вялікага пісьменніка Н. В. Гогаля. Да гэтай знамянальнай даты яны выканалі некалькі работ. Пеця Харчоўка і Коля Тамусяк выразалі барэльеф Н. В. Гогаля. Цікава выканана і скульптура «Тарас на кані». На высокім дужым кані сядзіць, абвешаны з усіх бакоў воінскай зброяй, Тарас і пільна ўглядаецца туды, адкуль павінен з'явіцца вораг. Коля Палякоў, які выразаў барэльеф, звярнуў увагу на раскрыццё характару Тараса. Удалася Палякову і другая работа, прысвечаная гэтаму-ж герою: барэльеф, на якім адлюстравана пакаранне Тараса Бульбы. Тарас паказаны мужным і непахісным барацьбітом. У апошнія хвіліны свайго жыцця ён думае не аб сабе, а аб сваіх байцах, аб іх выратаванні. У гарачым парыве, увесь падаўшыся наперад, ён загадвае казакам прадаўжаць барацьбу з ляхамі.

Дзеці любяць паэзію народнага песняра Беларусі Янкі Купалы. Рыхтуючыся да 70-годдзя з дня нараджэння паэта, яны выканалі дзве работы: барэльеф і скульптуру. Найбольшую цікавасць, безумоўна, уяўляе скульптура: Янка Купала сядзіць на ўскраіне лесу, на пяньку, і глядзіць у далечыню.

Зараз юныя рэзчыкі працуюць над скульптурай, прысвечанай дружбе Янкі Купалы і Якуба Коласа. У гэтай рабоце яны імкнуцца выказаць сваю шчырую любоў і павагу да народных паэтаў Беларусі.

П. РУНЕЦ.



Кампазіцыя «Мы за мір». Скульптура «Чапаеў на кані». Барэльеф «Пакаранне Тараса Бульбы».

Фота В. Вяхоткі.

# Ясны зоры залацістыя

*Музыка Д. ЛУКАСА.* *Словы А. РУСАКА*




Узнялося сонца яснае
Над палямі, над азёрамі
І да шчасця ўсе дарожанькі
Асвяціла над прасторамі.

Пралягла адна дарожанька
Беларускімі палянамі,
А другая завіваецца
Між літоўскімі курганамі.

А латвійскімі разлогамі
Стужкай трэцяя звівалася,
І ля возера Дрысвяцкага
Тры дарогі скрыжаваліся.

Вышлі людзі к таму возеру
З думай сталінскаю светлаю
Будаваць электрастанцыю
З песняй вольнаю, прыветнаю.

Закіпела праца дружная
Над азёрнымі нізінамі,
Зашумелі воды быстрыя
У турбінах над глыбінамі.

І у хатах светлай радасцю
Ясна зоры засвяціліся.
Да Масквы з падзякай шчыраю
Дружна песня пакацілася.

Ой, ляці ты, песня, птушкаю
Над калгаснаю старонкаю,
Беларусь, Літву і Латвію
Акрыляй ты славай звонкаю.

Праслаўляй іх працу дружную,
Працу мірную, свабодную,
Сілу іх усемагутную,
Дружбу іх усенародную.

## Юбілей самадзейнага калектыва

Далёка за межамі свайго раёна славіцца драматычны калектыў Брагінскага раённага Дома культуры.

Нядаўна калектыў адзначыў свой пяцігадовы юбілей. За гэты час пастаўлена 30 совецкіх п'ес. З асаблівай цеплынёй сустракаюць гледачы спектаклі па п'есах «Рускія людзі» К. Сіманава, «Канстанцін Заслонаў» А. Маўзона, «У стэпах Украіны» А. Карнейчука, «Пяюць жаваранкі» К. Крапівы.

Самадзейны калектыў і яго кіраўнік Е. Шайкевіч выхавалі групу здольных выканаўцаў — М. Кацуба, А. Санько, І. Уласенка, Р. Апаровіч, Я. Сычок і інш.

Каля 200 разоў выступіў калектыў перад насельніцтвам гарадскога пасёлка і калгаснікамі. На шматлікіх аглядах мастацкай самадзейнасці калектыў неаднаразова атрымоўваў грашовыя прэміі і ўзнагароджан 9 граматамі.

Цяпер калектыў рыхтуе пастаноўку п'есы А. Карнейчука «Макар Дубрава».

(Наш кар.).

Брагінскі раён,
Палеская вобласць.

# Партыйныя арганізацыі і сельскія бібліятэкі

Нашы бібліятэкі адыгрываюць выключна важную ролю ў справе комуністычнага выхавання працоўных. Партыя і ўрад надаюць вялікую ўвагу бібліятэкам, павелічэнню кніжных фондаў.

Поспех работы кожнай бібліятэкі залежыць ад увагі да яе з боку мясцовых парторганізацый. Там, дзе партыйныя арганізацыі накіроўваюць работу бібліятэк, роля апошніх у паспяховым вырашэнні гаспадарчых задач вялікая. Аб гэтым гаворыць жыццёвая практыка.

Шмат цікавага і каштоўнага зрабіла за апошні час бібліятэка калгаса імя Пушкіна Варатынскага сельсовета, дзе бібліятэкарам працуе сакратар комсамольскай арганізацыі тав. Шаўцова. Бібліятэкар не абмяжоўвае сваю работу абменам кніг. Толькі за апошні год у калгасе праведзены шматлікія канферэнцыі чытачоў, прысвечаныя абмеркаванню кніг па сельскай гаспадарцы, канферэнцыі па тэмах: «Мой любімы герой», «Гераічная барацьба кітайскага народа за сваё вызваленне» і інш.

Усе гэтыя мерапрыемствы бібліятэка праводзіла сумесна з партыйнай арганізацыяй калгаса.

Актыўна ўмешваецца ў работу калгаснай бібліятэкі і партыйная арганізацыя калгаса «Гігант». Павучальным у рабоце гэтай партыйнай арганізацыі з'яўляецца тое, што пытанні бібліятэчнай работы абмяркоўваюцца на партыйных сходах. Комуністы-агітатары дапамаглі бібліятэкару скласці рэкамендацыйныя спісы, паклапаціліся аб павелічэнні кніжнага фонда бібліятэкі, што дало магчымасць забяспечыць перасоўкамі паляводчыя брыгады.

У апошні час сур'ёзна займаецца пытаннем бібліятэчнай работы Бабруйскі раённы камітэт партыі. Перш за ўсё былі прыняты меры па палепшанню работы райбібліятэкі. Галоўным недахопам у яе рабоце з'яўлялася слабая сувязь з сельскім насельніцтвам. Райком партыі прапанаваў заг. бібліятэкі т. Балашовай стварыць шырокую сетку перасовак у паляводчых брыгадах. У раёне была створана 51 бібліятэка-перасоўка. Калгасныя парторганізацыі вылучылі бібліятэкарамі перасовак актыўных сельскіх комсамольцаў.

Вялікая ўвага звернута на камплектаванне бібліятэк. У гэтым нам дапамог месячнік кнігі, які нядаўна праходзіў у рэспубліцы. Партыйныя арганізацыі райспажыўсаюза і многіх калгасаў абмяркоўвалі пытанне ўдзелу ў месячніку. Многія загадчыкі сельмагаў трымалі ў час месячніка шчыльную сувязь з сельскімі бібліятэкамі і дапамагалі ім папаўняцца літаратурай. Для палепшання кніжнага гандлю на вёсцы была павялічана колькасць кніганош.

Цяпер у раёне 103 бібліятэкі, многія з іх маюць кніжны фонд у 1—2 тысячы тамоў.

Аднак там, дзе парторганізацыі абмежаваліся толькі камплектаваннем бібліятэк і не клапаціліся аб масавай рабоце з чытачом, бібліятэкі працуюць нездавальняюча.

У бібліятэцы калгаса імя Горкага налічваецца 2331 экз. кніг, а чытачоў — усяго 60 чалавек, з іх — калгаснікаў толькі 25 чалавек. Партыйная арганізацыя калгаса і яе сакратар тав. Бабкоў не займаюцца бібліятэкай, не дапамагаюць ёй разгарнуць прапаганду кнігі, выкарыстаць багаты кніжны фонд.

Аддзел прапаганды і агітацыі райкома прыцягнуў групу сельскіх комуністаў з ліку настаўнікаў і спецыялістаў сельскай гаспадаркі для дапамогі сельскім бібліятэкам. Сельская інтэлігенцыя дапамагае бібліятэкам у правядзенні канферэнцый чытачоў, складанні рэкамендацыйных спісаў літаратуры, афармленні кніжных вітрын.

Побач з канферэнцыямі чытачоў у асобных калгасах райком прапанаваў раённай бібліятэцы праводзіць міжкалгасныя канферэнцыі чытачоў і абавязаў партыйны актыў раёна ўзяць на сябе ініцыятыву ў падрыхтоўцы канферэнцый. У апошні час такія канферэнцыі праводзіліся ў калгасах імя Александра Неўскага, імя Мічурына, імя Дзержынскага, імя Леніна і інш. У гэтых канферэнцыях удзельнічалі калгаснікі некалькіх калгасаў. Планы міжкалгасных канферэнцый чытачоў зацвярджаюцца аддзелам прапаганды і агітацыі райкома, а планы калгасных канферэнцый чытачоў — пярвічнымі парторганізацыямі.

Пярвічныя партыйныя арганізацыі прыцягнулі ў лік актыўных чытачоў тых таварышаў, якія займаюцца ў гуртках партыйнай і комсамольскай асветы. Прапагандысты рэкамендуюць слухачам гурткоў літаратуру, дапамагаюць бібліятэкарам ствараць кніжныя вітрыны па асобных тэмах вучэбнай праграмы гурткоў партыйнай асветы.

Калгасная бібліятэка сельгасарцелі імя Громава стварыла спецыяльную бібліятэчку ў дапамогу агітатарам. Такія бібліятэкі будуць створаны ва ўсіх калгасах.

З мэтай павышэння кваліфікацыі бібліятэчных работнікаў і абмену вопытам у раёне праводзяцца штомесячныя семінары сельскіх бібліятэкараў.

У далейшым райком вырашыў заслухоўваць справаздачы асобных бібліятэкараў.

Палепшаннем дзейнасці бібліятэк партыйныя арганізацыі актыўна спрыяюць павышэнню культурнага ўзроўню калгаснікаў, справе комуністычнага выхавання мас.

**П. ПАДГОРНЫ,**
**заг. аддзела прапаганды і агітацыі Бабруйскага РК КП(б)Б.**

## У Саюзе совецкіх пісьменнікаў БССР

Сакратарыят ССП СССР вырашыў правесці ў Мінску ў канцы жніўня і пачатку верасня творчы семінар беларускіх дзіцячых пісьменнікаў. На семінары будуць абмеркаваны новыя творы беларускай дзіцячай літаратуры.

У рабоце семінара прымуць удзел дзіцячыя пісьменнікі Масквы і брацкіх саюзных рэспублік.

* * *

Гэтымі днямі адбылася творчая сустрэча совецкіх пісьменнікаў Беларусі з аўтарам аповесці «Спытак, знойдзены ў Сунчоне» пісьменнікам Р. Кімам.

Кім расказаў аб сваёй рабоце над аповесцю.

За час свайго прабывання ў Мінску Р. Кім сустрэўся з чытачамі на аўтазаводзе, на абутковай фабрыцы, на мясакамбінаце, у клубе Ільіча, на цагельных заводах, на велазаводзе, у рэспубліканскай партыйнай школе, у Палацы піянераў, у бібліятэцы імя Горкага і інш.

# Сатыра на падпальшчыкаў вайны

**(Э. Кіо на манежы мінскага цырка)**

Цырк — любімае народам відовішча. Яго наведваюць тысячы гледачоў, перад якімі гімнасты, акрабаты, жанглёры і эквілібрысты дэманструюць сілу і спрыт, смеласць і фізічную загартоўку. У цырку выхоўваецца любоў да спорту, тонкі мастацкі густ.

Аднак мастацтва цырка не абмяжоўваецца толькі спортам. Цырк — гэта трыбуна, з якой магутна гучаць гнеўны фельетон, дасціпныя рэпрызы, сатырычнае джала якіх накіравана на выкрыццё мярзотнасці капіталістычнага ладу і буржуазнай маралі, звярынага аблічча амерыкана-англійскіх падпальшчыкаў вайны.

Сваёй вострай ідэйнай накіраванасцю вызначаецца і трэцяя праграма, якая цяпер дэманструецца ў мінскім цырку, асабліва ілюзіі і пантамімы на міжнародныя тэмы ў выкананні заслужанага артыста РСФСР Э. Кіо.

Мастацтва Кіо маштабнае, захапляючае. Яго ілюзіі і фокусы маюць сваёй першакрыніцай народны тэатр, яго гумар і вынаходлівасць. Імкненне папулярнага артыста і ўсяго творчага калектыва, які працуе з ім, выкарыстаць майстэрства ілюзіі і пантамімы ў мэтах прапаганды барацьбы за мір — высокароднае імкненне.

Цэнтральнае месца ў выступленнях Кіо займаюць сатырычныя сцэнкі «На ўскраіне Парыжа» (аўтары тэкста В. Бахноў і Я. Касцюкоўскі) і «Амерыканская галава» (тэкст Н. Смірнова-Сакольскага).

У сцэне «На ўскраіне Парыжа» Э. Кіо трапна паказвае, як пад выглядам «анёла міру» амерыкана-англійскія заправілы пасылаюць у Карэю ўзброеных салдат, тых, хто знішчае карэйскія гарады і вёскі, атручвае і спальвае жанчын і дзяцей. Ён выкрывае хлуслівых французскіх дэмакратаў, выводзіць на манеж страшныя маскі Чэрчыля, Джона-Фостэра Далеса, дэ Голя, Ціта, Франко — самых агідных главароў сучаснага крыважэрнага імперыялізма.

Сцэнка «Амерыканская галава» ўяўляе сабой дасціпную сатыру на «дактрыну Трумэна», гангстэрскую амерыканскую літаратуру, на прадажных кінаартыстаў Галівуда і на сучасны амерыканскі тэатр.

Артыст едка высмейвае нізкапаклонства перад прагніўшай культурай буржуазнага захаду.

Востра сатырычныя — сцэнка «Дзіцячая цацка» з нажом і пародыя на буржуазнае правасуддзе, накіраванае супраць народа, які прагна жадае міру і змагаецца за мір.

Выступленне Кіо заканчваецца ўрачыстым шэсцем на тэму барацьбы за мір і заклікам: «Сталін — гэта мір». Гэта знаходзіць гарачы водгук у сэрцах гледачоў, якія цёпла вітаюць творчы калектыў цырка — выканаўцаў змястоўнай праграмы.

Новая праграма Э. Кіо, значная па баявой актуальнасці сваёй тэмы, каштоўная і тым, што яна гучыць не дэкларацыйна, не з'яўляецца дадаткам да гімнастаў, а ўвасоблена ў самастойным багатым цыркавым прадстаўленні, якое займае асноўную частку праграмы. У ім удзельнічае ўвесь калектыў цырка. У гэтай праграме асабліва ярка праявілася і сатырычнае майстэрства Э. Кіо, яго таленавітасць і добры мастацкі густ.

Хочацца пажадаць артысту і яго калектыву яшчэ большай патрабавальнасці да тэкстаў і сцэнарыяў выступленняў на міжнародныя тэмы, вызвалення ад тых элементаў забаўляльнага штукарства, якія яшчэ ёсць у праграме і пэўным чынам зніжаюць яе сатырычную завостранасць.

Выступленне Э. Кіо на манежы мінскага цырка — сведчанне росту ідэйнасці і культуры цырка, добрага густу яго мастацкага кіраўніцтва.

**М. МОДЭЛЬ.**

*ПА СТАРОНКАХ АБЛАСНЫХ ГАЗЕТ*

# У гуртках мастацкай самадзейнасці

Магілёўская абласная газета «За радзіму» ад 5 жніўня ў карэспандэнцыі з Касцюковіч паведамляе, што брыгада ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці раённага Дома культуры за перыяд сенаўборкі дала ў калгасах 39 канцэртаў. У праграме канцэртаў — п'еса У. Краўчанкі «Шыла ў мяшку не схаваеш», частушкі, народныя песні і танцы, творы совецкіх кампазітараў.

* * *

Полацкая абласная газета «Большэвіцкі сцяг» у падборцы інфармацый з Дрысы знаёміць чытача з работай драматычнага калектыва раённага Дома культуры ў калгасах і соўгасах.

У калгасах «Верны шлях», «Чырвонаармеец», соўгасе «Дрысенскі» Сар'янскага сельсовета, а таксама ў калгасах Бігосаўскага сельсовета была пастаўлена п'еса І. Лукоўскага «На варце бяспекі». У Боркавіцкім сельскім клубе драмгурток паставіў камедыю Янкі Купалы «Паўлінка», а драмгурток калгаса імя Сталіна Жоўнінскага сельсовета — камедыю А. П. Чэхава «Предложение».

Газета таксама паведамляе, што ў першай, трэцяй і пятай брыгадах калгаса «Новы шлях» Прудзінкаўскага сельсовета адкрыліся добра абсталяваныя клубы. Абсталёўваецца калгасны радыёвузел. У 130 хатах ужо ўстаноўлены радыёрэпрадуктары.

* * *

«Нядаўна праведзены гарадскі фестываль драматычных калектываў Пінска, — піша А. Макарэвіч у артыкуле «Спектакль самадзейнага калектыва» (газета «Палеская праўда»), — паказаў вялікую цікавасць да тэатральнага мастацтва».

Фестываль з'явіўся стымулам да арганізацыі новых творчых калектываў. Найбольш цікавым з'яўляецца нядаўна створаны калектыў клуба чыгуначнікаў станцыі Пінск, які падрыхтаваў да пастаноўкі п'есу А. Карнейчука «Платон Крэчат» (мастацкі кіраўнік І. Сакольскі).

А. Макарэвіч адзначае, што на фестывалі ўсё-ж недастаткова былі прадстаўлены спектаклі па п'есах беларускіх драматургаў.

*ФЕЛЬЕТОН*

# Рэчыцкі „летапісец"

З некаторага часу думкі аб славе парушылі спакой жыхара горада Рэчыцы Івана Малахавіча Савіцкага. Пасля доўгага роздуму названы грамадзянін рашыў заняцца літаратурнай дзейнасцю і на першым часе пазнаёміць шырокую грамадскасць з сабой праз газеты.

Новы карэспандэнт дзейнічаў актыўна і напорыста. Часта ў адрас рэдакцый розных газет прыходзілі ёмкія канверты з Рэчыцы. А ў канцы кожнага месяца з Мінска, Гомеля і іншых гарадоў у адрас «Рэчыца, Вакзальная, 227, І. М. Савіцкаму» пачалі прыбываць паштовыя пераводы на атрыманне ганарару.

«Э-э-ге!.. Значыць, справа мая не толькі слаўная, а яшчэ і грашовая», — рашыў пра сябе Іван Малахавіч і падбадзёрыўся.

З гэтага часу ён лічыў сваім абавязкам штодзённа пасылаць допісы. Ва ўсіх допісах Савіцкага пераважала адна літаратурная якасць — гіпербала. Адным росчыркам пяра рэчыцкі «летапісец», нібы ў казцы, узводзіў цудоўныя палацы, разгортваў магутнае наступленне на балоты, наладжваў гарачыя дыспуты па абмеркаванню новых кніг і наогул рабіў з мухі слана. Пяро фантазёра не ведала межаў. Івану Малахавічу здавалася, што ён восьвось будзе на вяршыні славы.

І раптам яму ўручылі наступнае пісьмо:

«Рэдакцыя «Звязды» за апошнія дні атрымала ад Вас рад інфармацый. Асобна трэба спыніцца на карэспандэнцыі пра экзамены ў школе № 1. Як відаць з паштовага штампа, Вы напісалі і здалі яе на пошту 20 мая, а экзамены пачаліся 21. Выходзіць, што Вы напісалі пра экзамены раней, чым яны адбыліся. Інакш кажучы, Вы напісалі тое, чаго на самай справе не было. Уявіце сабе, у якое непрыемнае становішча вы маглі паставіць рэдакцыю, і ці можам мы пасля гэтага друкаваць матэрыялы Вашы!».

А яшчэ праз некаторы час на галаву Івана Малахавіча пасыпаўся цэлы рад непрыемнасцей. Прыкладна такога-ж зместу пісьмы ён атрымаў з рэдакцый іншых газет. Што-ж датычыцца раённай газеты «Зара комуны», то яна яшчэ раней адмовілася ад «паслуг» Івана Малахавіча.

Пасля такога грому «летапісец» на нейкі час прыціх і стаў чакаць. Чакаў усю восень і зіму. А з прыходам вясны ў яго сэрцы з новай сілай зайгралі страсці да славы і ганарару. З воклічам «Ёсць яшчэ порах у парахаўніцы!» ён дастаў крыху ўжо заіржавелае пяро і з натхненнем пачаў пісаць. Ён нікуды не выязджаў, але па-ранейшаму апісваў падзеі ўсяго наваколля. Навошта марна траціць дарагі час і сродкі? Ёсць-жа раённая і абласная газеты. Адтуль ён і чэрпаў сваю інфармацыю. Іван Малахавіч з кожным днём удасканальваў сваё майстэрства і паступова перайшоў да замалёвак і нарысаў.

Праўда, пасля перажытых непрыемнасцей Іван Малахавіч праяўляе больш асцярожнасці. Цяпер крыніцай яго твораў сталі леташнія газеты і часопісы, а на дапамогу пяру ён паклікаў нажніцы і клей. Вось і паспрабуй, злаві такога шаўкача! А калі ён што-небудзь і крадзе з сённяшніх газет, то не так, як раней, ад кропкі да кропкі, ад коскі да коскі, а са сваімі каментарыямі і папраўкамі, часцей за ўсё блытанымі. Гэта выглядае прыкладна так:

«Калектыў нашага завода паспяхова выконвае ўзятыя на сябе сацыялістычныя абавязацельствы па дастойнай сустрэчы міжнароднага свята 1 Мая, — пісаў 25 красавіка ў раённай газеце дырэктар цікавага завода «Інтэрнацыянал» С. Смірноў. — З адыходаў дроту і драўніны асвоен выраб 8 новых відаў прадукцыі. У першым квартале ад рэалізацыі прадметаў масавага ўжытку, якія выраблены з адыходаў, атрымана прыбытку 37.300 рублёў. Стаханаўцы Валянцін Галавінскі, Іван Еўцюшэнка, Аляксандр Шулепа, Іван Абрамоўскі зменныя нормы выпрацоўкі выконваюць на 150 — 200 працэнтаў».

А Іван Савіцкі аб тым-жа цікавым заводзе 26 красавіка напісаў наступнае:

«Калектыў рабочых Рэчыцкага цікавага завода «Інтэрнацыянал» паспяхова выконвае абавязацельствы сацыялістычнага спаборніцтва (?). З адыходаў дроту і драўніны асвоен выраб 8 новых відаў прадукцыі. Толькі ў першым квартале ад рэалізацыі прадметаў масавага ўжытку, якія выраблены з адыходаў, атрымана прыбытку 37 тысяч рублёў(?). Стаханаўцы Валянцін Галавінскі, Іван Еўцюшэнка, Аляксандр Шулепаў (?), Іван Абрамоўскі зменныя нормы выконваюць на 150 — 200 працэнтаў».

І паляцела гэтая пісаніна ў газету «Звязда». Відаць, Іван Малахавіч думаў, што пра яго леташнія грахі там забыліся і зноў дадуць яго творам «зялёную вуліцу».

Атрымаўшы пакеты Савіцкага, таварышы з рэдакцыі прачыталі іх, пасмяяліся і ў адзін голас усклікнулі:

— Жыве курылка!

Зноў, як і летась, на галаву летапісца пасыпаліся непрыемнасці. Толькі цяпер ужо яны яго не спалохалі. Ён працягваў і працягвае складаць усё новыя, нікому не патрэбныя «летапісы» і дасылае ў рэдакцыі рэспубліканскіх газет. У свае горак з лішнім гадоў Іван Малахавіч да таго захапіўся літаратурнай дзейнасцю (правільней — плагіятам), што нават забыўся аб сваіх абавязках і званні настаўніка. На заняткі ён спазняўся, да ўрокаў не рыхтаваўся. Такія паводзіны Івана Малахавіча нікога не маглі задаволіць, і аднойчы яму прапанавалі пакінуць школу.

Час у такім плане зрабіць прапанову Івану Малахавічу і ў яго журналісцкай дзейнасці.

Іван Малахавіч, прапануем...

**І. НАУМЕНКА.**
**В. ПЛЕШАВЕНЯ.**

## „Беларускія апавяданні"

У ленінградскім газетна-журнальным і кніжным выдавецтве вышаў гэтымі днямі вялікі зборнік апавяданняў беларускіх пісьменнікаў у перакладзе на рускую мову Е. Мазалькова, А. Ракоўскага, А. Астроўскага, Ус. Раждзественскага, П. Кабзараўскага і Н. Вагнера.

У кнізе змешчаны апавяданні М. Лынькова, Я. Маўра, К. Чорнага, І. Шамякіна, Э. Самуйлёнка, І. Гурскага, І. Дуброўскага, П. Кавалёва, Ус. Краўчанкі, А. Кулакоўскага, М. Лупсякова, І. Мележа, П. Пестрака, М. Ракітнага, Ю. Рудзько, А. Стаховіча, Т. Хадкевіча і Я. Шарахоўскага.

Кніга адкрываецца артыкулам Я. Коласа «Некалькі пажаданняў».

Зборнік выдадзены тыражом у 30 тысяч экземпляраў.

# У цёмным царстве купецкай Расіі

**(«Навальніца». Новы спектакль тэатра імя ЛКСМБ)**

★ П. СУШКО ★

Калектыў тэатра імя ЛКСМБ паспяхова працуе над лепшымі творамі совецкай і рускай класічнай драматургіі. Такія спектаклі, як «Любоў Яравая», «Юнацтва бацькоў», «Зыкавы» і, нарэшце, «Навальніца», удала і правільна пастаўленая нядаўна тэатрам (рэжысёр П. Маркін, мастак В. Балуеў) — сведчаць аб гэтым.

Спектакль «Навальніца» прайшоў з поспехам. І поспех гэты заслужаны.

Тэатру ўдалося стварыць спектакль, які паказвае драму цэлай эпохі. У гэтым асноўная і галоўная заслуга калектыва. Спектакль кампазіцыйна пабудаваны правільна. Драматычная напружанасць узмацняецца ад акта да акта.

Скразная дзея ў «Навальніцы» вызначаецца непрымірымым канфліктам паміж імкненнем перадавых людзей да свабоднага выяўлення сваіх духоўных інтарэсаў і рэакцыйнымі маральнымі ўстоямі таго часу. Невыпадкова Ганчароў пісаў: «У «Навальніцы» ўляглася шырокая карціна нацыянальнага побыту і нораваў».

«Прамень святла», які прабіў непраходную цемру звярынай маралі дзікіх і кабаніх купецкай Расіі — сэрцавіна спектакля. У ім раскрыты не толькі асабісты, але і сацыяльны канфлікт п'есы.

Промнем святла ў цёмным царстве Дабралюбаў назваў Кацярыну. І, гаворачы аб спектаклі, трэба ў першую чаргу гаварыць аб вобразе Кацярыны. Удача гэтага вобраза забяспечвае спектаклю поспех.

Ці ёсць у тэатры артыстка, дастойная гэтай ролі? Так, ёсць. Кацярына ў выкананні С. Івановай — значная ўдача спектакля, нават пры тых недахопах, якія ёсць яшчэ ў Кацярыне-Івановай.

С. Івановай удалося стварыць запамінальны вобраз чыстай, праўдзівай і валявой жанчыны, якая імкнецца да волі, палымяна пратэстуе супраць акружаючай рачаіснасці, цемрашальства, хлусні, руціны і кансерватызма.

Артыстка знайшла яркія сцэнічныя фарбы для абмалёўкі характару моцнай і ў той-жа час вельмі няшчаснай жанчыны. Артыстка даносіць да гледача душэўную драму Кацярыны, яе пратэст супраць «цёмнага царства».

У лірычных месцах голас артысткі гучыць мякка, асабліва там, дзе раскрываецца чуласць і дабрата Кацярыны. Мова Кацярыны-Івановай музычная. Асабліва артыстцы ўдаюцца месцы, дзе Кацярына апавядае. Тут яе мова народная. Напрыклад: «Устану я, бывала, рана, калі летам, дык схаджу да крыніцы, памыюся, прынясу з сабой вадзіцы і ўсе-усе кветкі ў доме палью».

Разам з тым С. Івановай варта яшчэ папрацаваць над словам у сваёй ролі.

У драматычных месцах С. Іванова іншы раз фарсіруе гук. Так, напрыклад, у пятай дзеі яе маналогі ў паэтычных месцах гучаць празмерна напружана.

Да недахопаў трэба аднесці і тое, што артыстка не перадае сэнсу паўтораў у тэксце. Яна паўтарае тэкст механічна, у той час як у Астроўскага паўторы ўспрымаюцца, як выяўленне ўсхваляванасці Кацярыны.

Не заўсёды тэмп і рытм мовы Кацярыны-Івановай адпавядаюць яе ўнутранаму стану, яе настрою. Так, напрыклад, для раскрыцця душэўнага стану Кацярыны ў канцы апошняга маналога патрэбны больш імклівы тэмп яе мовы, больш перарыўны рытм.

Добра праводзіць артыстка маналог з ключом, аб якім у свой час Дабралюбаў пісаў:

«У маналогу з ключом мы бачым жанчыну, у душы якой рашучы крок ужо зроблены, але якая хоча толькі як-небудзь «загаварыць сябе».

Рэжысёру і актрысе ўдалося паказаць асабістую драму Кацярыны, як драму грамадскую, як неазбежную сутычку жыццёвых сіл з пануючым ражымам прыгнёту «цёмнага царства», як рашучы пратэст супраць яго панавання.

Глядач успрымае трагедыю Кацярыны, як яе востры і непрымірымы канфлікт з сацыяльна-бытавымі догмамі акружаючай яе рэчаіснасці.

Светлым промнем у цёмным царстве самавольства, апрача Кацярыны, з'яўляецца і Кулігін — самавучка-механік і паэт (артыст К. Жукаў). Артыст паказвае Кулігіна перш за ўсё як чалавека, які абараняе інтарэсы простых людзей, чалавека з адкрытай душой, які імкнецца да ўсяго добрага і ўзвышанага.

«Навальніца» А. Астроўскага ў тэатры імя ЛКСМБ. У ролі Кацярыны — **С. Іванова**, Ціхана — **М. Абрамаў**, Кабаніхі— **О. Захарава**. Фота **І. Салавейчыка**.

Да ўдачы спектакля трэба аднесці і вобраз Дзікога ў выкананні артыста П. Маркіна. Асабліва ярка актор раскрывае сацыяльную сутнасць Дзікога-самадура.

У нейкай меры вобраз Дзікога дапаўняецца Кабаніхай, хоць вобраз Марфы Кабанавай мае зусім самастойнае значэнне. Астроўскі пісаў, што роля Кабаніхі — «адна з самых важных у п'есе». Артыстка О. Захарава зразумела, якое месца займае гэты вобраз у раскрыцці ідэі твора. Кабаніха-Захарава — ваяўнічы абаронца руціны і цемрашальства. Яна прыкрывае сваю эксплаататарскую сутнасць і дэспатызм маскай знешняй дабрачыннасці. Асабліва ярка падкрэслівае артыстка бессардэчнасць Кабаніхі, садызм і ханжаства. Такім людзям, як Дзікой і Кабаніха, для падтрымання сваёй улады неабходна рэлігія. Таму Кабаніха і трымае каля сябе багамолку Фяклушу (артыстка А. Шлякава), хлуслівую і ліслівую ханжу-папрашайку.

Артыстка Шлякава іграе няроўна. Ёй трэба адмовіцца ад гугнявасці ў вымаўленні тэкста, таму што гэта ёй не ўдаецца.

Ролю Барыса выконвае артыст Ю. Уласаў. Ён падкрэслівае ў Барысе слабасць яго характару, сціпласць, добрасардэчнасць. Уласаў паказаў усю «нязначнасць» гэтага чалавека, аб якім Дабралюбаў пісаў: «Барыс — не герой, ён далёка не варты Кацярыны, яна і пакахала яго больш на бязлюддзі».

Б. Канцадалаў правільна выявіў зерне вобраза Вані Кудраша — маладога чалавека з практычным розумам і грубаватым прастадушшам.

Артыст М. Абрамаў, які выконвае ролю Ціхана, паказаў, што ён валодае майстэрствам пераўвасаблення. Дастаткова супаставіць яго ігру ў спектаклі «Любоў Яравая», дзе ён выконвае ролю моцнага, валявога рэволюцыянера Кошкіна, і яго выкананне ролі слабага, бязвольнага, бесхарактарнага, але сціплага і добрага па сваёй прыродзе купецкага сына Ціхана, каб зрабіць такі вывад. Актор іграе роўна. Удала праводзіць ён сцэну роспачы Ціхана пасля смерці Кацярыны, дзе слабы, нясмелы чалавек становіцца выкрывальнікам сваёй мацеры.

Артыстка Т. Заранок знайшла разнастайныя інтанацыі для вобраза свавольна-грубаватай Варвары. Заранок даносіць да гледача духоўную прымітыўнасць Варвары, уменне прыстасоўвацца, абмежаваны свет яе інтарэсаў, хітрасць.

Тэатру ўдалося стварыць спектакль мастацкі пераканальны. Большасць вобразаў вырашана правільна. І нягледзячы на тое, што сюжэтна дзея драмы абмежавана купецка-мяшчанскім побытам горада Калінава, тэма п'есы значна шырэйшая. Тэатр зразумеў яе і перанёс гэта ў спектакль.

Афармленне спектакля дапамагае ў асноўным стварэнню патрэбнай атмасферы. Але зроблена яно часам неахайна. Так, напрыклад, у дэкарацыях чацвертага акта адсутнічае перспектыва. Сабор, які стаіць на беразе, дзе адбываецца дзея, значна меншы за аб'ект, што знаходзіцца на другім беразе Волгі. Часта на заднікі відаць цені галінак дрэў, якія стаяць спераду.

Афармленне, якое адлюстроўвае прыроду (волжскія пейзажы), ўсё-ж не перадае той прыгажосці, якая прыводзіла Кулігіна ў захапленне:

«Вось, браце ты мой, пяцьдзесят гадоў я кожны дзень гляджу на Волгу і ўсё наглядзецца не магу...

Выгляд незвычайны! Прыгажосць! Душа радуецца!».

Масавыя сцэны (I, IV і V дзеі) не ўключаны арганічна ў дзеянне.

Спектакль «Навальніца» ўдаўся ў галоўным, хацелася-б бачыць яго больш дапрацаваным і ў дэталях.

**Галоўны рэдактар Васіль ВІТКА.**
**Рэдакцыйная калегія: Заір АЗГУР, Уладзімір АЛОЎНІКАЎ, Алесь БАЧЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Васіль БУРНОСАЎ, Кастусь ГУБАРЭВІЧ, Ірына ЖДАНОВІЧ, Павел КАВАЛЕЎ, Аляксей КУЛАКОЎСКІ, Пімен ПАНЧАНКА.**

АДРАС РЭДАКЦЫІ: г. Мінск, Совецкая, 34. Тэлефоны: галоўнага рэдактара і намесніка галоўнага рэдактара 2-31-94, адказнага сакратара 2-32-04, аддзелаў літаратуры, мастацтва і публіцыстыкі 2-14-94, выдавецтва і бухгалтэрыі 2-54-45.

АТ 76475. Друкарня «Чырвоны друкар», г. Мінск, Рэволюцыйная, 12.